Калі прыйдзе час вяртання? ☞ 8

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Каляда ў Плёсках ☞ III

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 53 (2642) Год LI Беласток, 31 снежня 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

НАШ ПЕРШЫ ПРЭЗІДЭНТ

Размова з Аляксандрам САСНОЙ, віцэ-прэзідэнтам Беластока

„Ніва": — Вы з'яўляецеся першым прэзідэнтам Беластока пасля 1989 года, які прызнаецца, што выводзіцца з меншаснага асяроддзя.

Аляксандр Сасна: — Да вайны 53% грамадскасці Беластока было яўрэйскага паходжання. Быў прыняты такі прынцып, што прадстаўнік меншасці мае быць ва ўправе горада. Такой асобай быў яўрэй, Аляксандр Райгродскі, паэт. Сёння, калі няма тут яўрэйскай грамадскасці, а ёсць беларуская, праваслаўная, іначай кажучы меншасная, калі амаль 20% насельніцтва Беластока можна прылічыць да нацыянальнай ці канфесійнай меншасці, дык тое, што ва ўладах горада ёсць прадстаўнік меншасці — гэта ніякае не дзіва. Гэта нармальнасць. На выбарах кандыдаты, падтрымліваныя Форумам меншасцей Падляшша, здабылі аж 4 месцы ў Гарадской радзе, а пятая асоба (гэта значыць я) атрымала прапанову стаць намеснікам прэзідэнта горада. І гэта не павінна выклікаць ні сумненняў, ні здзіўлення.

— Адкуль у Вас такая патрэба дзейнасці дзеля іншага чалавека, таксама як і ў Вашай сястры Алы, раднай Бельскага павета і, у духоўным аспекце, таксама ў Вашага бацькі Рыгора Сасны?

— Відавочна, гены. Як ведаеце, мой бацька — святар, незвачайны духоўны, паколькі ў вясковым прыходзе, і ён нам прышчапіў такія рысы, каб быць ветлівым і дапамагаць іншым. І гэта, мабыць, з гэтага вынікае.

— І што будзеце рабіць як віцэ-прэзідэнт Беластока?

— Я намеснік прэзідэнта, хоць, на амерыканскі манер — віцэ-прэзідэнт ці віцэ-мэр гэта добра гучыць. Я ў сваё распараджэнне, пад непасрэдны нагляд, атрымаў аддзяленні: архітэктуры, геадэзіі, грамадзянскіх спраў, камунікацыі, адміністрацыйна-гаспадарчае, крызіснага кіравання, гарадской стражы і ЗАГС. У кожнага аддзялення свае неадкладныя справы для афармлення. У аддзяленні камунікацыі, напрыклад — пытанне стаянкі па вуліцы Браніцкага. Трэба зрэфармаваць працу стражы, каб была больш паспяховая ў забеспячэнні спакою і бяспекі грамадзян, каб не асацыявалася толькі як служба, якая накладае штабы на колы машын.

— Ці беларускае асяроддзе Беластока можа разлічваць на Ваша лабіраванне нашых спраў?

— Я чыноўнік, на якога могуць разлічваць усе жыхары горада, незалежна ад паходжання і канфесіі, хоць я не скрываю свайго праваслаўнага веравызнання. Мяне падтрымоўваюць Форум меншасцей Падляшша і царкоўныя ды меншасныя арганізацыі. Гэта многа сказана — лобі, але я напэўна прыхільным вокам буду глядзець на ўсе пытанні, звязаныя з меншасцямі ці веравызнаннямі. Ды гэта не можа мець значэння хто да мяне прыйдзе па справах — беларус, паляк, праваслаўны, католік ці мусульманін. Я буду для іх, бо і ўстанова існуе для грамадзяніна, а не грамадзянін — для ўстановы.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

— А Вы як мяркуеце, ці беларусы за гэтыя гады — з 1989 года — добра адчувалі сябе ў Беластоку?

— За гэты перыяд беларуская, канфесійная меншасць не мела завялікага, значнага ўплыву на палітыку Гарадской управы, настолькі, каб беларусы, жыхары Беластока, успрымаліся як тыя, якія могуць поўнасцю карыстацца сваімі правамі. Часта прымаліся пад увагу адносіны чужых дзяржаў да польскай меншасці, якая пражывае на іхняй тэрыторыі (такія самыя павінны быць адносіны да польскіх грамадзян беларускага ці іншага паходжання). А гэта памылковая ўява. У нас, меншасці, такія самыя правы як і ў іншых грамадзян, а тое, што мы — беларусы і праваслаўнага веравызнання гэта наш козыр. Грамадзяне падыходзяць да гэтага нармальна. Ніхто не будуе тут ніякай Беларусі ці якойсьці асобнай праваслаўнай краіны.

— Даходзіла раней у Гарадской управе да розных інцыдэнтаў, напрыклад, у справе пабудовы праваслаўных храмаў. Што трэба зрабіць, каб не даходзіла да такога тыпу канфліктаў?

— Гэта пытанне да Гарадской рады. Я магу толькі сказаць, што прэзідэнт Тадэвуш Трускаляскі ў сваёй выбарчай праграме і пры кожнай нагодзе падкрэсліваў, што хоча яднаць жыхароў Беластока. Ужо ягоны падыход сведчыць аб тым, што іншым будзе стаўленне да нацыянальна-канфесійных меншасцей Беластока. Пры распрацоўцы гарадскога плана прасторавага добраўпарадкавання наша епархія звярнулася была назначыць на будучыню лакалізацыю цэркваў, якія могуць быць пабудаваны. Беластоцкая прэса пракаменціравала гэта такім чынам: „Царква дамагаецца пляцоў пад будову цэркваў", а гэта была толькі просьба ўказаць месцы, дзе такая царква магла б узнікнуць.

— А ці будуць нейкія ўказанні да дзейнасці ўстаноў культуры, падлягаючых Гарадской управе, наконт беларускай культуры?

— Я не адказваю за культуру, але мяркую, што тут непатрэбныя ўказанні. Каб было нармальна, патрэбны час. І не трэба намагацца, каб „перагнуць" у зусім другі бок, напрыклад, што калі віцэ-прэзідэнт праваслаўны, дык і 30% чыноўнікаў мае быць таксама праваслаўнымі ці беларусамі, паводле парытэту. Будуць аб'яўлены конкурсы, і кожны жыхар Беластока мае права падаць заяву на працу ва ўстанове. Усё залежыць ад адпаведных кваліфікацый.

— На канец скажыце пару слоў аб сабе.

— Я нарадзіўся 21 верасня 1963 года ў Орлі. Па адукацыі я юрыст, закончыў філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку ў 1987 годзе, пасля год служыў у арміі як падхарунжы, першую працу атрымаў у страхавой фірме ЗУС, пасля ў Акруговым інспектараце працы ў Беластоку. Жанаты — жонка Анна, дачка Кацярына — студэнтка III курса рускай філалогіі. З'яўляюся сакратаром Брацтва свсв. Кірылы і Мяфодзія ды калекцыянерскай суполкі *Szukamy Polski*. Жыву ў блоку, езджу на пяцігадовым аўто.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Застаецца толькі спадзявацца ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Новы год і новыя надзеі. Так было заўсёды. Асабліва калі стары год тых надзеяў не спраўдзіў. А спадзяванні былі... Ды яшчэ якія.

2006 год быў годам прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі і годам надзеі на кардынальныя змены. Падзеі на Украіне прынеслі і беларусам нейкую ўпэўненасць у тым, што і ў нас можа быць пэўны зрух. Асабліва верыла ў гэта моладзь...

Разам з Вамі ☞ 2

Яўген ВАПА

Ізноў мы апынуліся на зломе года. З чарговымі добрымі і благімі досведамі ўсё ж спадзяемся на лепшае — для сям'і, сяброў, грамадства, краіны. І ў свае асабістыя мары таксама варта паверыць, бо маем на гэта права. Хопіць да гэтага дабавіць крыху непахіснасці ў рэалізацыі сваіх задумаў і... усё атрымаецца...

Беларускі гонар — гміна Чыжы ☞ 3

Аляксей МАРОЗ

Трэба таксама памятаць, што гэта жыхары Чыжоўскай гміны найбольш масава (у маштабе ўсёй Польшчы) ў час апошняга перапісу насельніцтва назвалі сябе беларусамі. Не скрываюць яны сваёй нацыянальнай прыналежнасці і не саромяцца публічна гаварыць аб беларускіх справах...

У Кнышэвічах ☞ 9

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Зараз за Кнышэвічамі ёсць невялікі ўзгорак, на якім, як былі мне сказалі тамашнія людзі, стаіць крыж. І што там калісь былі могілкі, на якіх ужо з незапамятных часоў ніякіх нябожчыкаў не хаваюць. Агульна глянуўшы на наш краявід відаць, што тут вёскі пусцеюць, палі зарастаюць спачатку пустазеллем а пасля і лесам....


Ікона прыхіляе неба ☞ I

Раіна СТЭФАНЧУК

„Ты, Госпадзе, Майстра ўсяму што існуе, прасвяці і кіруй душою ды целам Тваіх слуг; вядзі іх рукі, каб маглі годна і дасканала прадставіць Твой лік, лік святой Маці Тваёй і ўсіх Тваіх святых, на хвалу радасці і прыўкрасы Тваёй царквы. Амінь". Так гучыць адна з малітваў іканапісцаў...

9 770546 196000

Застаецца толькі спадзявацца

Новы год і новыя надзеі. Так было заўсёды. Асабліва калі стары год тых надзеяў не спраўдзіў. А спадзяванні былі… Ды яшчэ якія.

2006 год быў годам прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі і годам надзеі на кардынальныя змены. Падзеі на Украіне прынеслі і беларусам нейкую ўпэўненасць у тым, што і ў нас можа быць пэўны зрух. Асабліва верыла ў гэта моладзь.

Беларуская палітычная апазіцыя сустрэла гэты год маючы адзінага лідэра ад аб'яднаных дэмакратычных сілаў і тысячы клопатаў. Трэба было збіраць подпісы, каб гэтага адзінага зарэгістравалі, а далей паэтапная прэзідэнцкая кампанія з максімальным вынікам у перспектыве. Праўда, на жаль, не ўсе максімальным вынікам лічылі абавязкова перамогу. Таму хіба яе і не ўбачылі. А ўлада на збор тых подпісаў вызначыла наваГоднія святы, калі звычайным грамадзянам не да подпісаў і не да палітыкі. Але подпісы сабралі. І не толькі аб'яднаная апазіцыя на чале з Аляксандрам Мілінкевічам. Збіралі подпісы і за Зянона Пазьняка, і за Аляксандра Казуліна. Гэты апошні за так званы паход на Акрэсціна, калі ён узначаліў шэсце, якое закончылася бойкай з сіламі „праваparadку" з прымяненнем дубінак і слёзацечнага газу, атрымаў пяць з паловай гадоў турмы. Аж да наступных прэзідэнцкіх выбараў.

А моладзь, якая паспрабавала пратэставаць супраць афіцыйна агучаных Цэнтрвыбаркамам вынікаў выбараў на плошчах Мінска і іншых гарадоў, таксама, разам з адзіным і старымі апазіцыянерамі наведала пакоі з кратамі на вокнах. Праўда, на невялікія тэрміны, да пятнаццаці сутак. Затое масава.

Вось так і прайшла першая чвэрць года. Безвынікова, затое хутка. На другую чвэрць апазіцыя як бы задрамала, затое ўлада дзейнічала па-ранейшаму актыўна. Яе галоўны палітычны партнёр Расія зноў пачала спробы падвышэння коштаў на газ і нафту. Доўгія перамовы і пошукі новых крыніц энергіі прывялі да думкі пабудаваць у Беларусі атамную электрастанцыю. Народ ніякай радасці і энтузіязму наконт гэтага не выказаў, але і баяцца новага Чарнобыля таксама не стаў. Відаць, жыццё такое, што ўжо больш нічога не страшна.

А з трэцяй чвэрці зноў прачнулася апазіцыя. Стала спрачацца паміж сабой пра тое, ці адзіны лідэр ад аб'яднаных дэмакратычных сіл захаваў сваю „карону" і надалей, ці адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў яго паўнамоцтвы скончыліся. Зрэшты, гэтыя спрэчкі хіба прынеслі больш актыўнасці чым самыя выбары. Усе, хто „за" захаванне паўнамоцтваў адзінага і ўсе хто „супраць", пачалі шукаць механізмы як перамагчы апанентаў. Надумаліся ў наступным годзе правесці кангрэс, які нібыта і расставіць усе коскі над „ў". Вось і першыя надзеі на будучы год з'явіліся. А пакуль што, у апошняй чвэрці года пачалася падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя саветы, якія будуць праведзены ўжо ў будучым годзе, акурат на старым Новы год. Але надзеі на гэтыя выбары ніхто не ўскладае. Можа, хіба што, толькі ўлада.

Вось і ўсё, збольшага, што ўспамінаецца пра 2006 год. Зразумела, што ў кожнага чалавека былі свае асабістыя радасці і праблемы, свае маленькія ўдачы і немаленькія трагедыі, але калі казаць пра ўсю краіну, то нават дзеючаму прэзідэнту наўрад ці многім атрымаецца пахваліцца падчас навагодняга прэзідэнцкага віншавання беларускаму народу. Бо нават тая агульнанацыянальная радасць для ўсіх беларусаў, маецца на ўвазе перамога ў судзе сяброў Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва", у яго прамове наўрад ці знойдзе месца.

І зноў застаецца толькі ўскладаць надзеі на надыходзячы год. Можа, маўляў, ён сам нам прынясе ўсё, што мы хочам. Бо калі казаць пра тое, што трэба для гэтага зрабіць самім, то на Беларусі хіба ніхто дакладна не ведае, што зрабіць. Ні ўлада, ні апазіцыя. Бо і адны, і другія напярэдадні адыходзячага года мелі нашмат лепшыя вынікі. Апазіцыя — адзінства і імпэт, а ўлада — танны газ і нафту. Зараз ні тыя, ні другія і таго не маюць. І застаецца толькі спадзявацца на лепшае. Можа зоркі лягуць добра. А можа і не. Хто іх ведае.

Віктар САЗОНАЎ

Разам з Вамі

Ізноў мы апынуліся на зломе года. З чарговымі добрымі і благімі досведамі ўсё ж спадзяемся на лепшае — для сям'і, сяброў, грамадства, краіны. І ў свае асабістыя мары таксама варта паверыць, бо маем на гэта права. Хопіць да гэтага дабавіць крыху непахіснасці ў рэалізацыі сваіх задумаў і… усё атрымаецца.

Для нашай рэдакцыі адыходзячы год быў часам выпрабаванняў. З аднаго боку да 16 мая знаходзіліся мы ў ліку падазроных і абвінавачаных пракуратурай у здзяйсненні прыдуманых фінансавых злачынстваў. Толькі поўнае апраўданне сябраў Праграмнай рады нашага тыднёвіка судом зняло кінутае на нас кляймо. Аднак я добра ведаю, што плёткі, звязаныя з гэтак званай „справай «Нівы»", распаўсюджваліся ў асяроддзі і надалей людзьмі, для якіх незалежная беларуская думка на Беласточчыне — гэта перашкода ў рэалізацыі іхніх, выключна асабіста-палітычных інтарэсаў, не маючых нічога супольнага з дзейнасцю ў карысць беларускай справы. Але ў час гэтых жа падзей мы атрымалі шматлікія словы падтрымкі ад нашых чытачоў і міжнароднай беларускай супольнасці. Дзякуй усім Вам за гэта. Людзьмі звацца — не пустыя словы.

З другога боку адыходзячы 2006 год быў таксама і юбілейным для нашай рэдакцыі. Пяцьдзесят гадоў з выхаду першага нумара газеты ў сакавіку 1956 г. у жыцці беларускай меншасці ў Польшчы знакавая падзея. Святкаванні з удзелам гасцей з усяго свету з-за судовых спраў былі перанесены на 14 кастрычніка, на прыпадаючыя ў гэты дзень святы Пакрова Прачыстае Багародзіцы і Дзень настаўніка. Святкаваць мы хацелі як людзі вольныя, не абцяжараныя судовай нагрузкай. Да юбілею прымеркавалі мы два адмысловыя выданні: фотаальбом «„Ніва" — час і людзі 1956-2006» і кнігу „Карэспандэнт праўду піша. Анталогія ніўскіх дописаў 1956-2005". У іх запісана штодзённае, вялікае і малое, святочнае і злабадзённае. Дзесьці аднак у мазгі і душу цвіком убіваецца думка і боязь: ці наша выдавецкая справа не з'яўляецца інстынктыўнай спробай запісаць перад сконам наша апошняе дыханне як нацыі? Ці імкненне запісаць усё на яшчэ пакуль зразумелай роднай мове гэта не генетычная абарона? Павеяла крыху сумам, але ж і сумнае становішча з беларускай мовай як у нас, так і ў Рэспубліцы Беларусь. Ад праўды не ўцячэш. Калі гэта сабе ўсведамляем, то ў натуральны спосаб можам яшчэ разам пазмагацца за нацыянальнае. За сваё, за роднае — мінулае і будучае. За тое, што маем права жыць дзе і як хочам, а не як і дзе нам кажуць. Або застанемся сабою і з нашчадкамі, або выкідаем сябе на абочыну і смеценіцу гісторыі. Тады наша месца зоймуць другія. Этнапрастора не пустуе, у ёй мацнейшыя выціскаюць слабейшых.

Але сыдзем з сумнага і павернемся да лепшага. Вось, шаноўныя чытачы, апошні Вам юбілейны падарунак ад рэдакцыі, здзяйсненне адной з нашых супольных мар — поўнацю каляровая „Ніва". Але, на жаль, пакуль такім будзе толькі адзін, менавіта гэты, нумар. А тое, ці ў 2007 годзе наша газета часцей зможа з'яўляцца ў такім выглядзе, усё залежыць ад Вас, наш беларускі народзе. Сённяшні тыраж „Нівы" з календаром складае 15 тысяч асобнікаў. І ўвесь ён разыдзецца. Крыху смешна мы выглядаем, калі чытаем толькі раз у год пра сваё і… раскашэлімся на два злотых у карысць роднага. А хопіць зрабіць падпіску на пошце ці ў пісьманосца або купляць газету ў кіёску. Можна падпісацца ў выглядзе падарунка сваім бацькам ці дзецям, якія жывуць побач нас, або раз'ехаліся па Польшчы ці ўсім свеце. Так робяць іншыя, якія адчуваюць важнасць прыналежнасці да сваёй нацыянальнай супольнасці. Вядома, ніхто нікога да нічога не прымусіць. Але мы самі даем жа такім чынам прыклад непавагі да свайго, адмаўляючыся ад такой звычайнай формы падтрымкі беларускасці ў выглядзе закупкі сваёй прэсы і другіх выданняў. Ой, цешацца варажэнькі з нашай нацыянальнай непісьменнасці і нігілізму.

Нягледзячы на ўсё вышэйсказанае я спадзяюся, што ў 2007 годзе ніўская сям'я будзе пашырацца. А рэдакцыя напэўна прыложыць намаганні, каб на старонках „Нівы" трывала будаваць беларускі дом дзеля наступных пакаленняў і чытачоў.

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Указанні пані міністр

Чарговы раз — 16 снежня — прайшла акцыя „Дзень салідарнасці з Беларуссю". У той дзень у Беластоку з'явіліся плакаты са здымкамі чатырох прадстаўнікоў беларускіх уладных структур, якія падазраваюцца „ў злачынствах супраць чалавецтва". Такім чынам была звернута ўвага на парушэнні правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у дзяржаве Аляксандра Лукашэнкі.

Акцыя 16 снежня амаль сышлася з уручэннем Аляксандру Мілінкевічу ўзнагароды імя Андрэя Сахарава ды з — далікатна кажучы — прыкрым інцыдэнтам на паграніпераходзе Кузніца — Брузгі. Праязджаў тудою суткі пасля плакатнай акцыі падляшскі ваявода Ян Дабжынскі, якому спадарожнічаў консул РП у Гродне. Ваявода быў госцем консульства на каляднай аплаткавай сустрэчы, у якой м.інш. удзельнічала Анжаліка Борыс, старшыня непрызнаванага рэжымам Саюза палякаў Беларусі. Ваявода намерваўся выехаць у Польшчу, па звычаю, дыпламатычнай паласой. Беларускія пагранічнікі, пасля таемных „кансультацый", загадалі яму з'ехаць на памежную паласу для турыстаў. Чакаў ён у чарзе тры гадзіны. Пасля ваявода гаварыў журналістам, што незалежна ад інцыдэнту, не крыўдуе, толькі спачувае беларускім пагранічнікам, якім прыходзіцца выконваць такія загады. Мушу прызнацца, што гэта годныя паводзіны, так сама як і заява, хоць усё здарэнне прыгадвае фашысцкія правакацыі ў адносінах да Польшчы і палякаў з 1939 года.

Тым часам, менавіта ў дзень інцыдэнту, удалося мне дайсці да ліста Анны Фатыгі, міністра замежных спраў, парутыднёвай даўнасці. Пані міністр напамінае ў ім аб прынцыпах, якія абавязваюць польскія дзяржаўныя ўстановы (ваяводы, для прыкладу, з'яўляюцца прадстаўнікамі ўрада ў глыбінцы). Я прачытаў у лісце: „У сувязі з пастаянным парушэннем уладамі РБ правоў чалавека і грамадзянскіх правоў ды ростам рэпрэсій у адносінах да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей (праслед дзеячаў СПБ) як Польшча, так і Еўрасаюз вырашылі аб замарожанні кантактаў з беларускімі ўладамі на міністэрскім узроўні..." Міністр Фатыга ўказвае ўтрымліваць на цэнтральным узроўні кантакты адно экспертнага, працоўнага характару, „што на практыцы абазначае ўзровень не вышэй чым дырэктара дэпартамента ў дадзеным ведамстве як з польскага, так і беларускага бакоў". На гэтым узроўні беларускія чыноўнікі могуць запрашацца выключна на навуковыя канферэнцыі ці шматбаковыя сустрэчы. Гэты прынцып датычыць таксама ваяводскіх устаноў (віцэ-дырэктары ці дырэктары дэпартаментаў). „Указваем пазбяганне кантактаў з вышэйшымі чыноўнікамі адміністрацыі абласцей, у якіх рэпрэсіям падвяргаліся дзеячы і структуры СПБ (Гродзенская і Брэсцкая вобласці)". МЗС намякае таксама на абмежаванне да мінімуму сустрэч з паслом РБ у Варшаве Паўлам Латушкам. „Сустрэчы з Паслом РБ выключна ў справах асаблівай вагі павінны адбывацца да ўзроўню дырэктара дэпартамента", — адзначае Анна Фатыга. Прытым прапанаваныя спадарыняй міністр дзеянні „не павінны інтэрпрэтавацца як намер адмянення супрацоўніцтва ў галінах, якія маюць рэальнае грамадскае значэнне (гаспадарка, памежны рух, барацьба са злачынствам, экалогія, культурнае супрацоўніцтва)".

Думаю, што аб пэўных прынцыпах датычных кантактаў з прадстаўнікамі рэжыму Аляксандра Лукашэнкі павінны памятаць не толькі чыноўнікі дзяржаўнай адміністрацыі. Час ад часу варта задумацца ці варта гасцяваць на прыёмах у беларускіх консульствах, гэтым самым даючы пажыву для рэжымнай прапаганды аб быццам бы адкрытасці і нармальнасці беларускай рэчаіснасці.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беларускі гонар — гміна Чыжы

Войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк на самаўрадавых выбарах атрымаў самую вялікую падтрымку (прагаласавала на яго звыш 86% выбаршчыкаў) ў Гайнаўскім павеце і адну з самых вялікіх у Падляшскім ваяводстве. Жыхары Чыжоўскай гміны таксама масава прагаласавалі за кандыдатаў у гмінных радных ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, з якога балаціраваўся таксама новаабраны войт. У Гмінную раду з пятнаццаці дэпутатаў увайшлі толькі радныя з гэтага камітэта, а іх контркандыдаты атрымалі намнога менш галасоў. На вельмі добры вынік запрацаваў войт Юрый Васілюк, кіруючы чатыры гады гмінай, разам з Радай папярэдняга склікання, у якой большасць радных складалі радныя ад Беларуска-народнага камітэта. Трэба таксама памятаць, што гэта жыхары Чыжоўскай гміны найбольш масава (у маштабе ўсёй Польшчы) ў час апошняга перапісу насельніцтва назвалі сябе беларусамі. Не скрываюць яны сваёй нацыянальнай прыналежнасці і не саромяцца публічна гаварыць аб беларускіх справах.

Войт Юрый Васілюк

Найстарэйшы радны Васіль Купрыяновіч

Трэба быць добрым войтам

— Трэба быць добрым войтам праз 4 гады і не рабіць інвестыцый толькі перад самымі выбарамі. Войт павінен хутка адклікацца на патрэбы людзей, — кажа новаабраны войт Юрый Васілюк. — Я вельмі сур'ёзна рыхтаваўся да выбараў, арганізаваў многа сустрэч з жыхарамі гміны, у час якіх гаварыў пра тое, што ўдалося зрабіць на працягу апошняга тэрміну. Знаёміў я таксама людзей з планамі на будучыню.

Разам з войтам у спатканнях прымалі ўдзел гмінныя і павятовыя радныя ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, якія выходзілі са сваімі прапановамі да выбаршчыкаў.

— Вялікая падтрымка выбаршчыкаў для мае асобы вельмі цешыць. Абазначае гэта, што наша грамадства падтрымлівае рэалізаваны накірунак развіцця гміны і новыя прапановы на будучыню, — гаворыць Юрый Васілюк. — У супольную праграму дзейнасці ўносілі свае заўвагі таксама кандыдаты на радных нашага камітэта, бо кіруючы гмінай мы мусім працаваць разам. Падвойны поспех, мой і нашых радных, абазначае аднак вялікую адказнасць перад выбаршчыкамі. Зараз мусім уважліва слухаць голасу людзей, якія нам даверылі.

Контркандыдатам на войта, які ў выбарах атрымаў пад 14% галасоў, быў Пётр Анішчук з Выбарчага камітэта „Самаабарона". Контркандыдаты на радных былі таксама толькі з гэтага камітэта. У выбарчых акругах, якія я наведаў, кандыдаты на радных з камітэта „Самаабарона" не набралі нават паловы галасоў, у параўнанні з кандыдатамі ад Беларуска-народнага камітэта.

— У нашым асяроддзі зніжаецца падтрымка для „Самаабароны", што магло мець уздзеянне таксама і на нашы выбары, — кажа Андрэй Ціханюк з Чыжоў.

Усіх радных Чыжоўскай гміны, выбраных ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, спалучае сельская гаспадарка, якая з'яўляецца галоўнай крыніцай утрымання ў гэтай вясковай гміне. Розняцца яны ўзростам і вопытам у самаўрадавай дзейнасці. Некаторыя радныя працуюць яшчэ па-за гаспадаркамі. Самым старэйшым дэпутатам з'яўляецца Васіль Купрыяновіч з Кленік, шматгадовы солтыс і грамадскі дзеяч. Наймалодшы радны — гэта Славамір Франкоўскі з Койлаў, які таксама засядаў у Гміннай радзе папярэдняга склікання. Мае суразмоўцы заўважылі, што Беларуска-народны выбарчы камітэт карыстаўся пашанай у грамадстве.

Падтрымалі Беларуска-народны выбарчы камітэт

— Нашыя людзі былі задаволены, што быў Беларускі камітэт, бо ў нас жывуць практычна толькі беларусы, — заяўляе Васіль Купрыяновіч з Кленік. — Каля малачарні ў нашай вёсцы гаварылі, што найлепш галасаваць на Беларускі камітэт.

— У нас усе лічаць сябе беларусамі і таму ішлі галасаваць на Беларускі камітэт, — дабаўляе наймалодшы радны Славамір Франкоўскі.

— У нас людзі найчасцей галасавалі на свой Беларускі камітэт, — кажа солтыс Чыжоў Андрэй Ціханюк, які стаў таксама гмінным радным. — У Чыжоўскай гміне жывуць амаль самі беларусы. Крыху палякаў жыве ў Асоўцы, Лушчах і Збучы.

Яшчэ да выбараў людзі хвалілі войта Юрыя Васілюка за вялікую актыўнасць і гаспадарнасць, а выбарчыя вынікі сталі толькі гэтага доказам.

— Людзі ў Чыжах хваляць войта Юрыя Васілюка за гаспадарнасць, парадак у гміне і за тое, што трымае дысцыпліну ў гміннай установе, — гаворыць Андрэй Ціханюк.

— У нас раней па-рознаму гаварылася пра войта Юрыя Васілюка, бо ўсім не дагодзіш. Аднак ён што мог, тое зрабіў і таму выдатная большасць галасуючых з Кленік і наваколля падтрымалі ягоную кандыдатуру, — гаворыць солтыс з Кленік Васіль Купрыяновіч. — Людзі ацэньвалі войта за яго работу. Ён жа дарогі будаваў, клубы рамантаваў. У нашай вёсцы таксама будзем праводзіць рамонт клуба.

Легітымнасць новаабранай улады падмацоўвае высокая яўка жыхароў Чыжоўскай гміны на выбарчых участках.

— Многа асоб пайшло на галасаванне, бо выбіралі ў нас аднаго кандыдата на дзве вёскі. Наш выбарчы ўчастак знаходзіўся ў Чыжах і малодшыя падвозілі на галасаванне старэйшых людзей, — кажа Іаланта Яканюк, радная з Асоўкі і заадно солтыс гэтага сяла. Сярэдняя прысутнасць на выбарах (для ўсёй гміны) перавысіла 60%.

— Высокая прысутнасць на выбарах паказвае, што нашы людзі спелыя ў сэнсе грамадскай актыўнасці, — заяўляе старшыня Гміннай рады Валянціна Якімюк (працавала на гэтай пасадзе таксама ў Радзе папярэдняга склікання).

Старшыня Гміннай рады Валянціна Якімюк

Чыжоўскі радны Андрэй Ціханюк

Мадэрнізацыя дарог і будова каналізацыі

Перад выбарамі многа гаварылася пра мясцовыя інвестыцыі.

— Жыхары ўсёй Чыжоўскай гміны хочуць, каб мадэрнізаваць у нас гмінныя і павятовыя дарогі. У большых вёсках людзі хочуць таксама будаваць каналізацыю, але гэта капіталаёмкая інвестыцыя, — кажа старшыня Рады Валянціна Якімюк.

— Пенсіянеры з Чыжоў не могуць ужо дачакацца каналізацыі. Людзі хочуць таксама, каб пашырылі ў нас дарогу і праклалі тратуары. Аднак праходзіць праз нашае сяло ваяводская дарога і войт можа толькі хадайнічаць у ваяводскім самаўрадзе ў гэтай справе, — гаворыць Андрэй Ціханюк.

— У Койлах рамантавалася святліца і мадэрнізаваліся палявыя дарогі. Цяпер людзі таксама хочуць каналізацыі, — інфармуе Славамір Франкоўскі.

— За апошнія чатыры гады мадэрнізавалася ў нас многа палявых дарог, пачалі мы перабудоўваць вясковую малачарню на клуб, а ў наступным годзе плануем завяршыць гэтыя работы, — кажа радная з Асоўкі і Шастакова Іаланта Яканюк.

Войт Юрый Васілюк кажа, што ў першую чаргу трэба будзе займацца будовай каналізацыі ў Чыжах, мадэрнізацыяй гмінных і павятовых дарог і рамонтамі святліц. Заяўляе ён, што з 1 студзеня 2007 года амаль напалову паменшаюць падаткі ад нерухомасці для прадпрыемстваў, каб такім чынам прыцягнуць інвестараў у Чыжоўскую гміну і стварыць новыя месца працы.

— Гмінная ўправа павінна быць прыязнай для людзей і адкрытай на супрацоўніцтва з рознымі асяроддзямі. Я стараўся рэарганізаваць працу Гміннай управы, — дадае войт.

Новаабраны войт абяцае надалей моцна ўспамагаць развіццё культуры ў гміне.

— Надалей будзем намагацца развіваць нашую беларускую культуру. Будзем падтрымліваць дзейнасць калектываў і спадзяемся стварыць маладзёжныя гурты. Будзем ладзіць археалагічны фэст у Збучы, фэст у Ляневе і іншыя культурныя мерапрыемствы.

Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

Мая падзяка

У аўторак, 7 лістапада мінаючага года, я ляжаў у ложку, бо ў панядзелак да гэтага я пакаўзнуўся на абледзянелых бетонных прыступках у хату і моцна пабіўся. Аж тут жонка кажа мне:

— Уставай, Коля, бо маеш госця з „Нівы".

Неяк, з бядою, падняўся я, апрануўся і падаўся ў кухню. А там ужо чакаў мяне галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Вапа. Пасля прывітання ён уручыў мне ўзнагароду за шматграннае супрацоўніцтва з рэдакцыяй з нагоды юбілею 50-годдзя тыднёвіка. На ўрачыстасці з гэтай нагоды, якая адбылася ў Беластоку, я, на жаль, з незалежных ад мяне прычын не мог прыехаць. Я вельмі шчаслівы, што „Ніва" такі сталы юбілей адзначыла. А ўзнагародай быў прыгожы партфель, прыдатны для карэспандэнцкай дзейнасці. Да гэтага былі далучаны цэнныя кніжкі на беларускай і польскай мовах. Асабліва прыгожы альбом „«Ніва», час і людзі 1956-2006". Гэта кароткая гісторыя самой „Нівы" і яе стваральнікаў. І там больш за старонку прысвечана і маёй скромнай асобе, за што ад мяне сардэчная падзяка рэдакцыі. У альбоме не прамінуты ніхто з ліку ніўскіх карэспандэнтаў. Гэта вельмі прыемны сюрпрыз карэспандэнтам і журналістам і не прыгадваю, каб якая іншая газета здагадалася такое зрабіць.

На 146-й старонцы я зняты з усімі пяццю пальцамі правай рукі, а вось ужо прамінула 23 гады, як у мяне гэтых пальцаў няма. А згадваю пра гэта таму, што на ўсіх маіх здымках з кавалерства правая рука чамусьці або недзе схаваная, або пальцы сціснуты ў кулак.

Я вельмі рады аўтабіяграфіі Міхася Хмялеўскага „За годам год", што пры такой нагодзе завітала пад маю страху; абавязкова яе прачытаю.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Адгалоска

У 49 н-ры „Нівы" ад 3 снежня 2006 г. прачытаў я артыкул Аляксея Мароза п.з. „Ці амалодзіцца сяло?" , у якім аўтар апісвае сяло Рэпіскі, што ў Гайнаўскай гміне. З Рэпіскаў, так сама як і з іншых вёсак на Усходняй сцяне, моладзь паўцякала ў гарады ў пошуках лепшага жыцця. Некаторыя даязджаюць на працу ў Гайнаўку, а калі вяртаюцца дахаты, то бяруцца за працу на бацькаўскай гаспадарцы. Такіх людзей пры Геркаўскай уладзе называлі „chłopo-robotnikami" і ім тады цяжка жылося, бо не атрымлівалі яны талонаў на мяса, цукар, папяросы ды гарэлку. Цяпер ім таксама нялёгка жывецца, бо з кожным днём усё даражэе, а зарплата стаіць у месцы. Вы, спадар Аляксей, добра ведаеце аб тым, што пішучы аб паміраючых натуральнай смерцю вёсках — нічога не зробім, каб памянялася жыццё на Усходняй сцяне, бо наша ўлада ды Еўрасаюз намагаюцца ўтварыць у нас „зялёныя лёгкія" не толькі Польшчы, але і ўсёй Еўропы.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Маюць голас у горадзе і павеце

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Намеснік старасты Бельскага павета Пётр Божка

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Старшыня Рады горада Бельск-Падляшскі Андрэй Сцепанюк

Поспехі кандыдатаў на радных Бельскай кааліцыі далі магчымасць рэальна ўплываць на выбар улад у Бельскім павеце і павятовым горадзе. Старшынёю Рады горада Бельск-Падляшскі стаў дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк, а намеснікам старшыні Рады павета быў выбраны Васіль Ляшчынскі, дырэктар „тройкі". Ва ўправу Бельскага павета з чатырох асоб увайшло двух радных Бельскай кааліцыі Пётр Божка, які зноў стаў віцэ-старастам і Міраслаў Бала, якія маюць рэальны ўплыў на кіраванне працай старостваі падлеглых яму ўстаноў.

У горадзе Бельск-Падляшскі

— Поспехам трэба лічыць тое, што 7 нашых кандыдатаў стала гарадскімі раднымі, а іншыя выбарчыя камітэты ўвялі ў Раду па менш асоб. Зразумела, што магло б быць яшчэ лепш і тады мы мелі б яшчэ большае ўздзеянне на працу Гарадской рады. Пакуль што, мы супрацоўнічаем галоўным чынам з камітэтам „Еднасць" і маем надзею, што гэтая нефармальная кааліцыя ўтрымаецца праз чатыры гады. Я стаў старшынёй Рады горада Бельск, а маімі намеснікамі былі выбраны двух радных з камітэта „Еднасць", — кажа старшыня Бельскай кааліцыі Андрэй Сцепанюк.

Старшынямі камісій у Бельскай радзе сталі 3 радных Бельскай кааліцыі, 3 радных з камітэта „Еднасць" і 1 радны з камітэта „Нашае Падляшша". У апазіцыі апынуліся радныя з клуба „Левыя і дэмакраты", якіх кандыдат Яўген Беразавец быў выбраны бурмістрам горада.

— Наша выбарчая кампанія была накіравана на падтрымку нашага кандыдата на бурмістра Пётра Божкі і яго пройгрыш з'яўляецца таксама нашым пройгрышам, — гаворыць старшыня Рады Андрэй Сцепанюк. — На яго слабейшы вынік магла мець вялікае ўздзеянне невялікая яўка жыхароў Бельска на выбарчых участках, якая перавысіла ўсяго 32%. На выбары пайшло мала людзей маладых і сярэдняга ўзросту, якія ў вялікай ступені маглі б падтрымаць нашага маладога кандыдата. Многа старэйшых людзей галасавала на нашага контркандыдата.

Я на першай гарадской сесіі сказаў, што такая невялікая яўка на выбарах (у першым туры мала яна рознілася), гэта ў выпадку Бельска паражэнне для дэмакратыі і трэба пераконваць маладых людзей, каб у будучыні хадзілі на выбары.

Роля Гарадской рады заключаецца ў галоўным у працы над пастановамі, якія пасля рэалізуе бурмістр з Гарадской управай. Аднак за Радай астаюцца таксама іншыя кампетэнцыі.

— Мы, як гарадскія радныя, будзем уважліва сачыць за працай бурмістра, а наша рэвізійная камісія, працай якой будзе кіраваць Марк Верамяюк з Бельскай кааліцыі, мае права кантраляваць работу бурмістра і падлеглых яму ўстаноў, — заяўляе Андрэй Сцепанюк.

Хаця апошнім часам кампетэнцыі бурмістра намнога ўзмоцніліся, за Радай надалей астаюцца вялікія магчымасці ўздзеяння на палітыку, якая будзе весціся ў горадзе.

— Мы будзем дамагацца рэалізаваць тое, што прапанавалі ў час выбарчай кампаніі. Я маю надзею, што палітыка сыдзе на другі план і мы будзем займацца істотнымі справамі. Перш за ўсё мы будзем намагацца, каб у горадзе ствараліся новыя месцы працы. Трэба, каб як найхутчэй будавалася каналізацыя і мадэрнізаваліся дарогі, асабліва ў тых месцах горада, дзе з інфраструктурай найгорш, — кажа старшыня Андрэй Сцепанюк.

У папярэдніх скліканнях радныя Бельскай кааліцыі намагаліся падтрымліваць у горадзе навучанне беларускай мовы і рабілі намаганні ў напрамку развіцця беларускай культуры.

— Бельская кааліцыя бачыць наш горад разнастайным у сэнсе нацыянальным і таму трэба падтрымліваць дзеянні ў напрамку развіцця культур усіх нацыянальнасцей пражываючых у Бельску, а ў тым ліку беларускай культуры і навучання беларускай мовы. Зразумела, што мы не хочам узвышаць ніякай з культур, бо ўсе яны важныя для развіцця горада, — гаворыць дыпламатычна старшыня Рады Андрэй Сцепанюк.

У Бельскім павеце

— Выбарчыя вынікі кандыдатаў на павятовых радных Бельскай кааліцыі лічу я памяркоўным поспехам. Хаця мы ўвялі ў Павятовую раду (4 радных — А. М.) на аднаго раднага менш, чым у папярэднім скліканні, надалей кіруем Бельскім паветам у кааліцыі з „Нашым Падляшшам", — кажа намеснік старасты Пётр Божка, які на гэтай пасадзе працаваў ужо чатыры гады. Дырэктар бельскай „тройкі" Васіль Ляшчынскі таксама на працягу апошняга склікання быў намеснікам старшыні Рады Бельскага павета. Новым членам управы стаў Міраслаў Бала, які на выбарах атрымаў вельмі вялікую падтрымку ў Арлянскай гміне (раней таксама быў павятовым радным).

Чацвёртым радным Бельскай кааліцыі стаў Юрый Ігнацюк, які быў выбраны старшынёю Камісіі асветы, культуры і публічнага парадку.

— У кааліцыі з „Нашым Падляшшам" мы будзем рэалізаваць выбарчую праграму Бельскай кааліцыі, у якой найважнейшыя ёсць дарожныя інвестыцыі. Мы будзем таксама моцна ўспамагаць асвету і ахову здароўя ў нашым павеце. Цяпер мы пачынаем больш падрабязна вызначаць інвестыцыі, якія будзем рэалізаваць на працягу чатырох гадоў, — гаворыць віцэ-стараста Пётр Божка. — Сярод праектаў выкананых на патрэбы школ, ёсць праект на тэрмамадэрнізацыю будынка Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча і з гэтым праектам мы будзем выступаць за еўрасаюзнымі сродкамі. Аднак у першую чаргу трэба будзе рамантаваць дах у белліцэі, які пачынае працякаць.

З выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў ладзіцца супрацоўніцтва паміж Бельскім паветам і горадам Высокае з Беларусі. У рамках гэтага праекта быў выдадзены альбом пра Бельскі павет і ладзілася супольная канферэнцыя ў Бельску-Падляшскім на тэму турыстычнага супрацоўніцтва.

— На 50% мы пабольшалі сродкі для няўрадавых арганізацый і таму больш грошай трапіць таксама для суполак, якія займаюцца прапагандаваннем беларускай культуры і да праваслаўных арганізацый, — інфармуе намеснік старасты Пётр Божка.

Бельскае староства пападвышае якасць сваёй працы і падлеглых яму ўстаноў.

— Мы атрымалі ўжо сертыфікат кіравання якасцю ISO 9001 і канчаем арганізаваць бюро абслугі кліентаў, — дабаўляе віцэ-стараста. — Зараз добрая кан'юнктура для развіцця Бельскага павета і ёсць у нас развіты горад. У вясковых гмінах на высокім узроўні стаіць сельская гаспадарка і трэба ісці ў напрамку развіцця прамысловасці па перапрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў.

Аляксей МАРОЗ

Мая Трансмалдавія

— 10 —

Са святой гары-каньёна ў Цыпаве блішчыць блакітнае люстра Днястра, якое здаецца нерэальным. Мы ў самым старажытным манастыры Малдавіі. Над вадой шыбуюць белыя чаплі, якіх спачатку блытаем з буслямі. Ад Прыднястроўя плыве лодка. Мы не адны на абрывістым пляцы царквы. Спачатку думалі тут заначаваць пад палаткай, але ў каньёне поўна змей. Калі мы дабіраліся ў манастыр, я ледзь рукой не ўхапілася гадзюкі, якая драмала на скальной тэрасе. Каб патрапіць у цэрквы, выкаваныя ў скале, мы прабіваліся стромкай, зруйнаванай кладкай, пакладзенай паўз крэйдавую сцяну. Унізе буялі дзікія кусты цярноўніку, бяздонна зіхацеў магутны Днестр.

У Цыпаўскі манастыр прывяла нас звычайная выпадковасць. Праўда, па дарозе мы распытвалі пра старажытныя цэрквы, якімі славіцца краіна. У Кішынёве ўсе хацелі нам дапамагчы, але не было з гэтага ніякага толку, бо кожны гаварыў іншае. Таксама на вакзале, калі мы хацелі набыць квіткі ў абранае месца, нас збівалі з панталыку:

Стары манастыр

— А да каго там едзеце? — пыталі па-сваяцку. Калі мы называлі манастыр, нас асцерагалі: — Там усё закрытае, вам трэба ў... — і тут называлі манастыры, пра якіх мы раней не чулі. Сітуацыя паўтрылася мо тры разы і мы рашылі, што самі выбярэм месца. Цыпава (па-румынску Tapova) гучала нейк знаёма. Ды і падыходзіў транспарт, якраз адпраўляўся аўтобус у бок Рэзіна. Шафёр пасадзіў нас на першыя месцы і сказаў: „Не перажывайце, я вас уладкую...”

А як жа, ён стрымаў слова. Высадзіў нас на нейкім скрыжаванні, дзе праз дзве гадзіны забраў нас аўтобус, што ехаў у раённы пасёлак Лялева. На прыпынку мы згаварыліся з сялянкамі, якія вярталіся з пакупак у горадзе. Малдаўскія кабеты прылюдныя і адкрытыя, быццам нашыя. Хоць між сабой яны размаўлялі па-румынску, мне здавалася, што гэта цёткі з Махнатага ці Барысаўкі. Елена, у хустачцы завязанай „шалухом”, распытала мяне пра сям'ю. Пасля дабыла з пластмасавага пакета гарачыя „плячэнда” (рулецікі з сырам) і пачаставала ўсіх на прыпынку. Нас, як мілых „дачушак” — на першым месцы. Незнаёмых жанчын румыны называюць „дачушкамі”, рыхтык на Ашмяншчыне ў Беларусі.

Ад галоўнай шашы ў Цыпава, дзе спыніўся аўтобус, было яшчэ тры кіламетры. Разам з намі ехаў мужчына-інвалід. Ён сам прапанаваў пачакаць сына, які меў пад'ехаць за ім на фурманцы. Мы падзякавалі, бо ж вельмі хацелася распрастаць косці. Тры цёткі з падлеткам, якія ехалі ў тым самым аўтобусе і якіх пасля мы сустрэлі ў манастыры, пакарысталіся конскім транспартам. Паўгадзіны пазней абагнала нас фурманка па берагі напоўненая народам. Людзі махалі ў наш бок і яшчэ раз запрасілі на воз. Цяжка было адмовіцца ад такога запрашэння, але нам шкада было коніка. У фурманкі былі драўляныя... колы. З другога боку мы любаваліся лесам, паўз які ішла гравейка. За ўвесь час пабыўкі ў Малдавіі мы ўпершыню пабачылі лес, раней бачылі адно загоны з кукурузай, сланечнікам і вінаградам.

У самым старажытным манастыры Малдавіі мы сустрэлі „еўрапейскіх” манахаў. Айцы і браты з доўгімі коскамі, хадзілі ў цывільнай вопратцы, з мабільнікамі. Іх малады ўзрост не дазваляў акрэсліць ні стан, ні іерархію. Спачатку мы разгубіліся. На месцы была адно белая царкоўка, сціплыя жылыя будынкі для манахаў, якія напаміналі баракі, дом паломніка і альтанка, спавітая морам экзатычных кветак. Тут, „на гары”, адпраўляюцца набажэнствы. Мы падаліся ўніз, да старых цэркваў. На месцы прывіталі нас белыя сцены. Хоць месца ахоўваецца дзяржавай, ад цэркваў асталося няшмат слядоў. У адной царкве на сцяне я прыкмеціла глагалічныя надпісы. У іншай вісела ікона. У асноўным манастыр выглядаў разграбленым і апаганеным. У адной келлі нехта зрабіў прыбіральню. Пад нагамі валяліся прэзерватывы. Раз-пораз урываліся сюды маладыя парачкі ў пошуках інтымнага куточка. Дзяўчаты ў адных станіках і шортах, хлопцы аголеныя, як на пляжы. Пасля з'явілася элегантная кампанія, выглядалі на працаўнікоў універсітэта. Яны ўвайшлі ў пячоры разам з сабакамі. Калі з левага прыднястроўскага боку прычаліла лодка, мы напалохаліся. У наш бок ішлі два хлопцы з бландзінкай. Яны прыселіся побач і папрасілі ў нас запалак. Дзяўчына патрабавала запаліць вогнішча....

Мы спадзяваліся, што неўзабаве пабачым чарговы акт савецкага варварства... Але тут не было простых схем.

— Я выпіваць у святым месцы не буду, — рашуча запратэставаў хлопец з Прыднястроўя.

Мы вярнуліся на гару, дзе манахі рыхтаваліся да вячэрні. У царкве мы сустрэлі цётак з дарогі. Апрача іх і манахаў прыйшлі яшчэ тры асобы з парафіі. На сцяне мы прыкмецілі ікону святога Сцяпана Вялікага. Для румынаў Сцяпан Вялікі (1457-1504) — як Усяслаў Чарадзей для беларусаў. Пры яго панаванні Румынія перажыла найбольшы росквіт, адваявала незалежнасць. Помнік храбраму князю сустрэнем у Кішынёве. Ікона напамінае гістарычную падзею. Паводле легенды Сцяпан Вялікі звянчаўся з князёўнай Марыяй Вахітай (Maria Voichita) якраз у Цыпаўскім манастры. Манастыр існаваў ужо з X стагоддзя. Пра славу і значэнне апавядаюць румынскія святыя кнігі, карціны. Месца чакае лепшага, надзейнага часу. Вядомае яно з дагістарычных часоў. Тут знойдзены сляды чалавека з XII ст. да нашай эры. Паводле легенды ў Цыпаве закончыў жыццё трацкі спявак і паэт Арфей. Зважаючы на вялікую колькасць гадзюк, лакалізацыя легенды паказалася сэнсоўнай. Пра тое, што тут знаходзяцца крыніцы міфаў, падказваў выгляд калодзежаў. Іх абудоўваюць аздобленым у народныя ўзоры домікам. Усярэдзіне ёсць ікона і кубачак... Для кожнага, хто хоча напіцца сапраўднай вады з глыбокай студні...

Вясковы калодзеж

У Цыпаве ўсе вароты аздоблены

(працяг будзе)

Тэкст і фота Евы СЦЕПАНЮК

— АДОЗВА —

Да колішніх жыхароў вёскі Боўтрыкі!

Пакуты людзей з затопленых вёсак былі вялікімі. Цяжка падабраць словы, каб трапна апісаць плач гаспадароў, якія беззваротна страцілі сваю любімую зямлю-карміліцу; зямлю, якую палівалі сваім потам, сваёй уласнай крывёю; зямлю, якая давала жыццё чарговым пакаленням лучан, руднян, боўтрыкаў, гарбароў, буднікаў... Яны былі соллю гэтай зямлі, напаўняючы яе мілагучнай беларускай мовай, звонкімі песнямі, беллю вышываных кашуль...

І трэба было пражыць шмат гадоў пасля затаплення, каб сум, туга па страчаным сямейным гняздзе, перарадзіліся ў дзеянне. Каб душы не мучыў пякучы да болю ўспамін, толькі каб пераўтварыўся ён у надзею ўваскрэсення. Уваскрэсенне здзяйсняецца цераз крыж. А старыя і новыя крыжы ад затопленых вёсак з'яўляюцца гэтага бачным знакам іх несмяротнасці.

Першы крыж-помнік узведзены быў у Луцэ. Невыпадкова так сталася. Гэта была самая вялікая з залітых вадой вёсак. У маштабе ўсяго рэгіёна вылучалася яна багацтвам традыцыйнай матэрыяльнай культуры. Яе жыхары былі актыўнымі, прадпрымальнымі, усебакова адоранымі людзьмі. Гэтая вёска магла астацца. Але драконаўскія меры чыноўнікаў і планавікоў перавялі яе ў адышоўшы свет. Так сама сталася з Рудняй — невялічкай, але грунтоўна пабудаванай вёсачкай. Па Божай волі вадасховішча не паглынула праваслаўнага прыдарожнага крыжа, пры якім калісьці адбываліся важнейшыя вясковыя ўрачыстасці. І гэты крыж стаў пачаткам адраджэння вёскі — не ў літаральным, але ў духовым сэнсе. Дзякуючы падтрымцы самаўрадавых улад, прыхадскога кліру і шматлікіх людзей добрай волі гэтае месца набыло новы выгляд. Колішнія жыхары і іх нашчадкі цяпер могуць сустракацца ў тым месцы, дзе калісьці маліліся іх продкі. Мабыць, нехта з патомкаў паставіць тут сабе дом. І так адродзіцца вёска....

Свет затопленых вёсак ва ўспамінах іх колішніх жыхароў паўстае быццам Аркадыя — краіна шчасця і здзейсненых мараў. Вёскі гэтыя жывуць, хаця ўжо даўно адышлі ў нябыт, у памяці іх колішніх насельнікаў. І гэтая памяць застыне ў крыжах.

Верым, што падобныя крыжы-помнікі паўстануць таксама ў іншых затопленых вёсках — Боўтрыках і Гарбарах. Нашу надзею падмацоўвае мудрасць самаўрадавых улад Міхалоўскай гміны ды ангажаванасць мясцовага насельніцтва і выхадцаў з затопленых вёсак. Многа разумных людзей адтуль выводзіцца. Можна, напрыклад, прыгадаць выдатнага журналіста Міхала Боўтрыка, які ў рэпартажах не раз спасылаецца на краіну свайго дзяцінства.

Марыя ХЛЯБІЧ, Рыбакі
Лявон ХЛЯБІЧ, Рыбакі
Віктар БУРА, Рыбакі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 55 —

— Вось і канец года, — бабуля завяршыла год, парваўшы на шматочкі старыя рахункі і квіты яшчэ з мінулага, 2005 года. Трымала іх столькі часу, і ні хвіліны больш, бо калі б хацела захаваць нават такія „памяткі", хата лопнула б па швах. А пра лістоўкі фірмаў усялякіх, якія завальваюць свет інфармацыямі аб сваіх вырабах дарагіх і танных, лепшых і неабавязкова добрых, няма што і гаварыць. Звычайныя паперы можна выкарыстаць як распалку ў печы, ды што рабіць з усім гэтым у горадзе? Дарэчы, звычайная папера калісьці раскладзецца ў прыродзе, ды цяпер да яе дадаюцца розныя дадаткі, фарбы, а гэта на сотні гадоў забруджвае свет!..

— А мне каляровыя ўсе гэтыя лістоўкі падабаюцца, — бурчаў Грак, хаваючы ў сваю кардонку няцэлыя ўжо акрайкі розных часопісаў. — Усё гэтае, як кажаце, смяццё. Не дам спаліць у печы такую прыгажосць! Схочацца паўзірацца, дык дастану і буду глядзець на гэтыя краявіды, на гэтых прыгожых людзей і жывёл...

Папраўдзе, на лістах, падабраных Граком, не ўсё было такое прыгожае — тое-сёе парваў дзюбай, там і паплямій ежай... Праўда, шмат хто з вас таксама любіць чытаць, падгрызваючы якое смакоцце? Нават тата зрання, спяшаючы на работу, за сняданкам сваю „Выбарчую газету" лістае. І ці бабуля што скажа на тату? Хутчэй на маму накрычыць, хоць мама таксама вялікая — яна ж бабуліна дзіцё...

Грак утаптаў сваю здабычу, каб менш месца займала ў скрынячцы. Накрыў зверху Гражынчыным часопісам „Брава". А сам паляцеў на кухню, напіцца вады — надта ж стаміўся заняткам.

А тут раптам бабулін смех з пакоя ды прыглушанае Мікіткава мяўканне!

— А, ты тут схаваўся? То ў канапу, то ў Гражынчын рукзак, то зноў у які пакет! А што ты тут робіш? О, як жа ж не заўважыла я гэта сметніка?! Я ж, здаецца тут ужо прыбрала?

— „Сметнік!!!" Знайшла! Забярэ! Выкіне! — Грак ад крыўды ўпусціў на кухонную цырату птушыную слязу, падобную на кроплю расы.

Міра ЛУКША

ПАДАРОЖЖА Ў КАЗКУ

Гала Маркова і мінская пяцёрка

— Кожнае дзіця таленавітае, незвычайнае, — кажа Галя Маркова, пецярбургска-беластоцкая піяністка і педагог.

Сустракаемся на фестывалі „Міжнародная мастацкая лабараторыя маладых". У камернай зале Беластоцкай філармоніі ставяць яшчэ дадатковыя крэслы, з'явілася намнога больш гледачоў, чым спадзяваліся. Сярэдзіна напамінае казку, на сценах красуюцца карціны з анёламі (мастачкі Беаты Васілевіч), ёсць фон — „вецер", ён выкананы з далікатнай фольгі. Пасля будзе яна гуляць-лунаць у час выступленняў. Канцэрт пачынаецца з казкі... Спадарыня Ганна Свентахоўская, пераапранутая за добрую фею, чытае фрагмент чарадзейнай прозы, а пасля запрашае на сцэну сваіх вучняў-анёлкаў... Сярод піяністаў — дзеці з музычных школ Беластока. Ёсць і вучні з Бельска-Падляшскага — Оля Сарокін, якую памятаю з конкурсу „Роднае слова".

І цудоўная пяцёрка з Мінска: Ясь Супоненка, Марыя Матвяецкая, Насця Аляксейчык, Андрэй Калаткоў, Аксана Купінір. Усе з мінскай Школы талентаў, якая працуе пры Беларускай музычнай акадэміі.

— Для нас вельмі важны канцэртны вопыт, — кажа Яўгенія Гарбунова, апякунка і педагог мінскай групы. За час фестывалю выступяць яны ў мастацкіх галерэях, шпіталях, інтэграцыйных школах. Паездку ў Бельск і сувеніры зафундавала ім беларускае Радыё Рацыя.

— Якая музыка патрэбная ў падарожжы ў казку? Тут у асноўным іграліі класіку: Шапэ на Бетховена, Чайкоўскага, Пракоф'ева... А найпрыгажэй іграліі мінчукі. Усюды, дзе яны паказаліся, выклікалі захапленне!

— Вы можа не пішыце гэтага, — сумняваецца спадарыня Галя (сёння, таксама як добрая фея), — але паслухайце як іграюць дзеці з Мінска! Нам жа яшчэ далёка да іх! Сапраўды, гэта быў цудоўны прыклад зладжанасці таленту і працы. А мы, публіка, мелі нагоду падацца ў казачнае падарожжа.

ЗОРКА

Залаты конкурс!

Дарагія Сябры! Цягам апошняга 2006 года мы адзначалі залаты юбілей, 50-годдзе „Нівы". З гэтай нагоды „Зорка" таксама падрыхтавала сюрпрыз: Залаты конкурс! Вашай увазе прапануем кароценькі тэст на тэму гісторыі і сучаснасці нашай старонкі. Варта пацікавіцца адказамі, бо мы спецыяльна вам падрыхтавалі каштоўныя ўзнагароды, у тым ліку mp3-плэеры, цыфравыя фотаапараты, новыя кашулькі і ланцужкі „Зоркі", юбілейныя альбомы „Нівы", альбомы пра сусветнае мастацтва і старыя цывілізацыі...

Паколькі пытанні кранаюць не толькі сучаснасць, дапамогі можаце папрасіць у сваіх настаўнікаў, бацькоў, старэйшых сяброў. **Адказы дасылайце да 31 студзеня 2007 года па звычайнай або электроннай пошце.** Побач адраса, калі ласка, назавіце свой узрост і пасведчанне настаўніка або бацькоў, што вы выпісваеце „Зорку".

Лаўрэатаў вылучым шляхам жараб'ёўкі, падвядзенне вынікаў у ***Дзень закаханых***, значыць, 14 лютага 2007 г., на „Валянцінкі".

А вось і пытанні:

І. Які беларускі паэт з 1957 года піша вершы спецыяльна для „Зоркі":

А: Артур Вольскі,

Б: Віктар Швед,

В: Юрка Гумянюк.

ІІ. Хто з былых журналістаў „Нівы" на працягу трыццаці гадоў рэдагаваў „Зорку"?:

А: Сакрат Яновіч,

Б: Уладзімір Паўлючук,

В: Яніна Чэрнякевіч.

ІІІ. Як называецца галоўная гераіня „Мухі ціп-топ"?:

А: Бася Муха,

Б: Соня Камарчук,

В: Міколка Матыліцкі.

Міколка Здрайкоўскі з Беластока

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

—11—

Пасля агульнага сходу бацькоў мае сябры яшчэ доўга не маглі выходзіць з хаты. Але калі Соня запрасіла мяне, Ганку, Касю, Соню, Міколку і Ігара ў суботу на коўзанку, мы ўсе цешыліся. Я даўно ўжо не каталася на каньках і спачатку крыху баялася ісці з сябрамі. Але дзяўчаты і Міколка паабяцалі, што мяне падвучаць. Калі я апынулася на коўзанцы, усе мае сябры раптоўна зніклі з вачэй і я асталася сама. Я была злосная, калі пабачыла іх па другім баку катка. Я стаяла як слуп і не ведала што рабіць. Пасля я неяк дабралася да борта і стала сама вучыцца. Я суцяшала сябе — калі што не атрымаецца, буду гаварыць што ў мяне „такі" стыль. Мне шанцавала...

Мая язда рассмешыла незнаёмых хлопцаў, якія каталіся побач. Адзін з іх пад'ехаў да мяне і прапанаваў, што можа быць маім інструктарам. Я была ў шоку, але згадзілася. Пасля першага „ўрока" я ўжо неяк каталася. Хлапец, які мяне вучыў, вельмі мне падабаўся. Называўся Максім. Пасля я пазнаёміла яго з Ганкай, Соняй, Касяй і Міколкам. З Ігарам не было патрэбы, высветлілася, што хлопцы — траюрадныя браты. Калі Ганка з Міколкам ад'ехалі ў іншы бок, а Соня, Кася і Ігар пайшлі сесці на лаўку, я асталася сама з Максімам.

Не ведаю калі гэта сталася, але ён узяў мяне за руку і мы так каталіся цераз доўгі час. У пэўны момант мы апынуліся па другім баку катка. І там... я пабачыла групу моладзі з маёй гімназіі. Быў гэта Пятрусь з II „а", Іонаш і іх найлепшыя сяброўкі. Калі нашы вочы сустрэліся, я загадала Максіму ад'ехаць у іншае месца. Мне было сорамна перад Петрусём і Іонашам, бо калі яны запрашалі мяне на коўзанку, я выкручвалася як магла, гаварыла ім, што не люблю катацца. Ну, а цяпер я шалела з нейкім хлопцам!.. І што яны цяпер пра мяне падумаюць? Я баялася пра гэта думаць. Пасля катка Максім папрасіў у мяне нумар „аські". Я не магла дачакацца калі сяду ў хаце за камп'ютэр і буду з ім гаварыць. На жаль, калі я вярнулася дадому, даведалася ад таты, што мой малодшы брат папсаваў мой камп'ютэр. Ён засунуў у дыскавод лісток сыру.

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Ніхто не браў

Пытае раптам Даротка
Сваю састарэлую цётку:
— Чаму ты, шыкоўная дама,
Дагэтуль не выйшла замуж?

— Дзетка, мой стан дзявочы
Ніхто ўжо спыніць не хоча.
— А ці ты, мая дарагая,
Усіх кавалераў пытаеш?

Снегавік

Красуе белая зіма,
Сядзець у хаце ўжо дарма.
Дзеці пачалі гукаць:
— Трэба ляпіць снегавіка!

Захапленне чутны крык:
— Прыгажун наш снегавік!
Хлопец моркаўку прынёс,
Ён будзе мець чырвоны нос!

Польска-беларуская крыжаванка № 53



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 49: Клас, сок, допыт, гутарка, гумар, ас, воск, стан, лёт, льгота, на. Лук, госць, густ, думка, нота, ніт, парк, сыр, ял, котка, ён, асвета.

Узнагароды, **кніжку „Дзяўчынка і хмарка" Міры Лукшы (з аўтографам)** выйгралі: **Паўліна Іванюк, Кацярына Панькоўская, Рафал Селіванюк, Іаанна Нявінская** з Бельска-Падляшскага, **Малгажата Сідарук, Івона Тэслюк** з Новага Корніна.

Каляровыя алоўкі атрымліваюць: **Якуб Цымбалюк** з Бельска-Падляшскага, **Уршуля Беразавец, Марта Каранецкая** з Нарвы.

Прыехала „Жэмэрва"!

„Жэмэрва" — гэтае слова абазначае вясёлую грамаду. У рэчаіснасці „Жэмэрва" з'яўляецца музычным гуртом з Бельска-Падляшскага, які 15 лістапада 2006 года завітаў у нашу школу, у Нарву.

Дзевяць асоб, у тым ліку тры дарослыя і шэсць гімназістаў, увайшлі ў залу апранутыя ў народную беларускую вопратку. Сярод іх быў шаноўны Дарафей Фіёнік, які прыігрываў на гармоніку ў час танцаў. Настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк павіншавала яго з прэстыжнай узнагародай імя Зыгмунта Глогера, якую яму ўручылі ў Ломжы.

Зала запоўнілася вучнямі Пачатковай школы і Гімназіі. Калі гурт пачаў спяваць, публіка проста анямела і ад голасу, і ад спеву. У выкананні гурту мы пачулі шмат песень з гэтага рэгіёна. Некаторыя з іх назаўсёды застануцца ў нашых сэрцах. Апрача спеваў быў таксама гістарычны конкурс-віктарына. За правільныя адказы пераможцы атрымалі „Бельскія гостінцы".

Незабыўнае, што ў час канцэрта „Жэмэрва" запрасіла нас танцаваць. Некаторыя адважныя вучні скакалі „польку" і іншыя танцы. Патрапілі яны добра развесяліць публіку. Можа таму, што гімназісты танцавалі са старэйшымі — і важна — малодшымі, не ўсім хапіла рук. Спадарыня Анна Фіёнік заахвочвала нас да практыкавання гэтых танцаў і песень.

Дырэктарка Гімназіі, шаноўная Аліна Кананюк вельмі цёпла падзякавала „Жэмэрве" за цудоўны канцэрт.

Кася СЯНКЕВІЧ,
гімназістка з Нарвы

Калі прыйдзе час вяртання?

Павел

Паўліна

Павел

— Думаем, каб вярнуцца, але на пенсію, хіба што знойдзем раней добра платную працу, — кажа Паўліна, выпускніца Гайнаўскага белліцэя, цяпер мама, жонка, якая якраз заканчвае другі факультэт. З мужам, Міркам, пазнаёмілася дзякуючы дзейнасці ў БАСе. Закахаліся і... цяпер разам з Дзям'янам жывуць у Варшаве.

— Пераехалі і астаемся. Тут большыя магчымасці рэалізаваць прафесійныя мары, большыя грошы, а і сяброў шмат. Але ведаю 6 чалавек, якія працавалі пару гадоў у Варшаве і пасля вярнуліся на Падляшша.

З аднакласнікаў Паўліны з вялікіх гарадоў у Гайнаўку вярнулася 5 асоб. Адразу пасля заканчэння ліцэя з Падляшша выехала больш за траціну. Гэта нават не так шмат у параўнанні з іншымі гадамі. У класе Юліты, паводле яе падлікаў, пераехаць з Гайнаўкі рашыла болей за 90%, але большасць з іх выбрала Беласток, таму што бліжэй, але ёсць такія што жывуць у Варшаве, Ольштыне, Любліне. Жывуць, вышэйшую адукацыю ўжо закончылі!

— У Гайнаўцы няма мне чаго шукаць. Разам з хлопцам ездзім там кожныя два тыдні, бо там нашы карані, там сустракаемся з сябрамі, якія атрымалі добрую працу і засталіся, ну, і зразумела, з сям'ёй.

Ужо год пазней, паводле ацэнкі Паўла, з матэматычна-фізічнага класа амаль 80% развіталася з бацькамі надаўжэй і наогул не вяртаюцца ўжо ў Гайнаўку, застаюцца працаваць там, дзе здабывалі вышэйшую адукацыю або мяняюць проста гарады, пакідаючы сабе шанц знайсці працу.

— Калі ў газетах гартаеш прапановы працы, то ў Мазавецкім ваяводстве ёсць іх пару тысяч, а на Падляшшы ўсяго каля 150, — кажа Андрэй, аднакласнік Паўла. Абодва паехалі ў Варшаву. Павел цяпер на стыпендыі ў Даніі, збіраецца пісаць працу, а Андрэй у кастрычніку закончыў міжнародныя адносіны на Варшаўскім універсітэце і шукае працы...

— 10 працэнтаў паехала за мяжу — за адукацыяй або за працай, і звязваюць з гэтым сваю будучыню, — кажа Павел. Аднак Юліта кажа, што яе сяброўка мае намер вярнуцца з-за мяжы. Сябра, які выехаў са сваёй дзяўчынай, пэўна таксама вернецца. Нават студэнты, мае аднакласнікі, найчасцей выязджалі ў час канікул, бывала, што заставаліся на год, але вярнуліся. Пэўна не вернецца Юлька, яна яшчэ перад атрыманнем атэстата сталасці паляцела ў Штаты і там цяпер яе жыццё.

— За мяжу наогул выязджаюць тыя, якім не ўдаецца тут працаваць па сваёй прафесіі, не маюць яшчэ сваіх сем'яў, — працягвае Паўліна. Але ад Касі даведваемся, што яе аднакласніцы жывуць у Расіі і на Украіне. Іх матывацыі былі іншыя, перш за ўсё, сямейныя.

Войтэк

Іншы Павел, аднагодак Паўліны і Юліты, не сочыць дакладна за лёсам сяброў. У яго сваё кола знаёмых. Ужо сёмы год жыве ў Варшаве і, як сам кажа, „змагаецца за паспяховае заканчэнне вышэйшай адукацыі". Але ў думках пра будучыню ў яго „поўны тупік". Аднак часта ездзіць у Гайнаўку, часцей чым пра эміграцыю думае пра аспект лакальнасці ў фармаванні тоеснасці маладога чалавека, пра значэнне беларускасці ў жыцці сярод польскай большасці.

— Эмігрант з правінцыі, калі адкіне сваю беларускую тоеснасць, ператвараецца ў грамадскага інваліда. Беларускасць гэта вялікі капітал, дзякуючы якому „ўраджэнец Беласточчыны" выклікае зацікаўленне ў палякаў. Сялянскасць гэта капітал! Толькі трэба ведаць як ператварыць гэты комплекс у штосьці, чым можна ганарыцца. На жаль, меншасная беларуская адукацыя не ўмее пакласці пачатку гэткаму ментальнаму працэсу ў маладых галовах.

Войтэк, які даволі часта таксама задумваецца над лёсам маладой беларускасці, звяртае ўвагу на тое, што ёсць магчымасць жыць здалёк ад сваёй бацькаўшчыны, адначасова будучы ўнутры. Вядома, трэба тады займацца беларускасцю навукова, прафесійна, або проста актыўна дзейнічаць у сваім асяроддзі.

— Выезд з Падляшша гэта не да канца свабодны выбар, гэта лёс, які вядзе да месца, дзе можна атрымаць лепшую адукацыю, на вышэйшым узроўні. Натуральна, за пяць, шэсць, а нават і сем гадоў жыцця ў іншым горадзе бывае, што там астаемся, там атрымоўваем працу як паслядоўнасць першых прафесійных спроб яшчэ ў час навукі. Чалавек будуе сабе сетку сяброў, якой не мае ўжо ў Беластоку, Гайнаўцы ці Бельску. Мае таксама свае прывычкі звязаныя з канкрэтным месцам, якое сваім маштабам і варыянтамі жыцця часта вызначае будучыню. Папросту ў такім горадзе як Варшава больш прапаноў для маладых.

— Тут маем шырэйшыя магчымасці доступу да сімвалічнага капіталу: лепшыя бібліятэкі, навейшыя фільмы, тэатральныя спектаклі. А без гэтага як без рук. У адсутнасці сімвалічных рэсурсаў заключаецца сутнасць правінцыі, і гэта не зменіцца, — дадае Павел.

— Сталіца Падляшша часам бывае непрывабнай па простай прычыне: яна надта блізка. Калі маладыя маюць выбар розных магчымасцей, рашаюцца спазнаць штосьці новае, хочуць жыць самастойна, здабываць жыццёвы вопыт, а гэта не так проста жывучы пры бацьках, — падкрэслівае Андрэй.

Олек, беластоцкі студэнт, выпускнік ліцэя № 3 у Беластоку, звяртаючыся да Андрэя, дадае цікавае назіранне:

— З майго класа тыя, якія прынамсі часткова дэкларавалі беларускую тоеснасць, не вярнуліся ўжо ў Беласток, але яны ніколі не зачыняліся ў беларускім гета, не прабавалі жыць у сабе толькі вядомай герметычна закрытай цэласці. А тое, што лічылі сябе беларусамі, дапамагала ім хутчэй адкрывацца на іншых людзей. Частка з іх страсна кружыць па свеце. Ведаю, што стопрацэнтна нельга спалучаць гэтай хваробы з нацыянальнымі пытаннямі, але магчыма жыццё і перыяд выспявання ў шматкультурным асяроддзі выклікалі роздумы пра своеасаблівую адзінку.

Такія адзінкі ў нейкі спосаб шукаюць сябе ў вялікіх гарадах.

— Знаходзім сябе, адчуваем сябе неяк натуральна, — кажа Кася, якая ў Варшаве знайшла сваю любоў — эмігранта з Беларусі. Кожны знаходзіць сваю беларускасць (нават кацапшчыну) такую, якую любіць: у царкве, на сустрэчах брацтва, у час пікетаў перад беларускай амбасадай, на супольных мерапрыемствах, але і ў хатнім зацішшы. Гледзячы на сяброў ведаю, што варта клапаціцца і даглядаць сваю беларускасць, бараніць яе ўсімі сіламі.

Паўліна дадае, што ў яе выпадку беларускасць таксама значыць шмат. Большасць яе сяброў гэта беларусы, якія часта сустракаюцца ў час мерапрыемстваў, пры нагодзе святаў. З імі можна пагутарыць „па-свойму".

— На маіх вачах беларускае жыццё ў Варшаве набрала нейкіх шалёных тэмпаў. Калі пачынаў я штудзіраваць, тады БАС быў ініцыятарам беларускага „ферменту" ў сталіцы. Цяпер мерапрыемстваў шмат, але, на жаль, часта іх узровень слабы (не ў сэнсе маштабнасці). Найцяжэй успрымаю ўсялякія пустыя беларускія салідарнасці, — распавядае Павел, які сам шмат робіць дзеля прамоцыі Падляшша і беларускасці ў сталіцы.

Што далей?

— Хацеў я б вярнуцца, але не было б там з чаго жыць... Гэта хіба такая стандартная прычына, — задумваецца Томэк, студэнт этналогіі і тэалогіі ў Варшаве.

Трэцякурснік з Любліна кажа, што зачаста не думае пра беларускасць, бо гэта вядзе да ўнутранага разладу. Расказвае ён пра канверсіі маладых беларусаў ва ўкраінцаў, але і згадвае станоўчыя гісторыі пра супольнае спяванне беларускіх песень у студэнцкіх інтэрнатах.

— Пра ліцэй расказваю ўсюды, усе здзіўляюцца, а я маю вялікі сантымент. А дзеці? Павінны ведаць што і як, але хутчэй перадам ім тое як інфармацыю, так будзе выгадней.

Андрэй затое падкрэслівае, што якраз школа мае вялікі ўплыў на свядомасць:

— Я сфармаваны па-беларуску, што будзе мець значэнне для маёй сям'і. Калі будзе такая магчымасць, пашлю дзяцей у беларускую школу.

Паўліна дадае, што апрача яе сям'і, у Варшаве толькі адна ёй вядомая выхоўвае дзяцей „па-беларуску". Паводле Олька, вяртанні будуць магчымыя ў далёкай будучыні, бо хто лепш дапаможа ў выхаванні дзяцей як не бабуля. Але ці гэта так далёкая перспектыва? Кася на вуліцах Бельска сустракае сваіх сяброў з дзіцячымі каляскамі, сужонцамі, але адказвае двудушна:

— Вяртаюцца нешматлікія, або сталыя, шчаслівыя, або звар'яцелыя дэсператы.

Мушу аднак прывесці і галасы тых, якія кажуць, што цяпер ужо кантэкст беларускай школы і своеасаблівага месца не мае аніводнага значэння. Жыццё ідзе ўперад. Часта нават не аглядаюцца за сябе, прыязджаюць толькі на святы, часам на адпачынак, хаця тыя, якім паспяхова развіваецца кар'ера, лётаюць у цёплыя краіны або іншыя нязведаныя месцы. Бацькаўшчына, бывае, гэта толькі бацькі, часам нейкі ўспамін, захаваны на здымках...

Ілона КАРПЮК

Вясёлка ў Кнышэвічах

Каля Кнышэвіч

Агульна глянуўшы на наш краявід відаць, што тут вёскі пусцеюць, палі зарастаюць спачатку пустазеллем а пасля і лесам. І здавалася б, што тут няма нічога цікавага. Здавалася б, што цікава і добра толькі там, дзе нас няма...

Зараз за Кнышэвічамі ёсць невялікі ўзгорак, на якім, як былі мне сказалі тамашнія людзі, стаіць крыж. І што там калісь былі могілкі, на якіх ужо з незапамятных часоў ніякіх нябожчыкаў не хаваюць.

Падаўся я быў улетку на той узгорак паглядзець тую тамашнюю даўніну. І застаў там даволі цікавы від. Той крыж, пра які гаварылі мне людзі, выразаны з каменя і больш па сутнасці нагадвае чалавечую фігуру з раскінутымі рукамі. Гэта такі гібрыд, дзе перакладзіна крыжовая, а стрыжань чалавекападобны — з шырокім тулавам і адкінутай у бок галавой крыху карыкатурнага кшталту. У наваколлі гэтай разьбы шмат байкаватых неабробленых камянёў, частка з якіх трымаецца вертыкальнай пазіцыі. Значыць, тут калісь, мабыць у дахрысціянскі час, сапраўды была некраполія. Толькі вось галоўная загваздка: што там робіць тая таямнічая каменная фігура чалавечага росту, што яна абазначае?..

У нашай школьнай гісторыі было гаварылася, што на шырокай славянскай тэрыторыі ў язычніцкі час бывалі драўняныя фігуры тадышніх багоў. А ці такія фігуры не маглі быць у нас каменнымі, пацікавіўся я. І давай я капацца ў бібліятэчных археалагічных часопісах. Аказваецца, што былі і каменныя выявы нашых язычніцкіх багоў; былі яны ў выглядзе слупа і стаялі, напрыклад, на Лысай гары недалёка Кельцаў ды на гары Суботцы, што ў Ніжняй Сілезіі. Гэтыя выявы не захаваліся да нашага часу, бо з ходам іх — мо прымусовай — дэсакралізацыі, тыя слупы людзі адразу парэзалі на жорнавыя камяні. Але ў 1848 годзе ў рацэ Збруч каля Гусятына на Падоллі быў знойдзены чатырохгранны каменны слуп, вышынёю ў 2,67 метра. Захаваўся ён мабыць толькі таму, што вернікі пагрузілі яго ў ваду, хаваючы ад руплівасці неафіцкіх місіянераў. На ім рэльефы адзінаццаці чалавечых істот. Няма адназначнай высновы, каго тая стэла прадстаўляе: ці гэта меў быць Род, ці Святавіт, ці мо абшырнейшы славянскі пантэон...

На тэрыторыі Беларусі ў санацыйны і савецкі час былі выяўлены каменныя ідалы чалавечага кшталту побач гістарычных гарадоў — Ваўкавыска, Слоніма і Шклова. Каменныя фігуры, г.зв. бабы, асталіся і ў Прусіі; магчыма, што і яны прадстаўлялі нейкіх язычніцкіх ідалаў. Такім чынам меркаванне, што каля Кнышэвіч стаіць не крыж, толькі каменны стод, здаецца быць апраўданым, бо і навокал былі падобныя.

І тут узнікае чарговае пытанне: чаму менавіта каля вясковых Кнышэвіч такая фігура асталася стаяць на яве, калі ў гістарычных гарадскіх цэнтрах такія выявы не захаваліся? І да гэтага яшчэ пытанне: чаму такая, як у даўніх гарадах, фігура стала менавіта ў Кнышэвічах? Ці мо гэтая сённяшняя вёска была ў далёкім мінулым нейкім важным грамадскім цэнтрам?

Дзеля высвятлення некаторых кнышэвіцкіх загадак падаўся я ў археалагічную майстэрню Падляшскага музея. Беластоцкія археолагі ведаюць пра Кнышэвічы адно тое, што відаць звонку. Што ў зямлі, невядома, бо дагэтуль раскопак там яны не праводзілі. Вядома толькі, што калісь была там некраполія, якіх на Беласточчыне больш, м.інш. каля Гаркавіч. Такім вось чынам са сваімі пытаннямі астаўся я сам...

Назва Кнышэвічы выводзіцца з таго ж кораня, што і больш вядомая назва Кнышын. А ў Кнышыне ёсць Замкавая гара, гэтак жа як і ў Гродне, як у Ваўкавыску Шведская гара, як у Холме Холмская, у Кракаве Вавель... І мо ў сівую даўніну ў Кнышыне валадарыў князь, які ў мясцовым дыялекце мог называцца крыху інакш. А дыялекты выклікаюць не менш цікавыя з'явы чым вясёлка. Возьмем для прыкладу звычайнага ката і перавядзем яго з Беларусі ў Польшчу праз адносна невялікую Гайнаўшчыну. Спачатку будзе гэта *кот*, пасля *куот*, далей *кыт* і на канец зноў *кот*. І мо па некаторай аналогіі тыя Кнышэвічы на строга літаратурнай мове ці не павінны называцца Князевічамі?..

Прыгадаў я сабе далей пра адно з найстарэйшых польскіх гарадзішчаў — у Страдаве, што каля Пінчава. Яно сёння асталося — можна сказаць — у чыстым полі. А вось іншыя сярэдневяковыя грамадскія цэнтры, напрыклад, не надта адлеглыя ад Страдава Вісліца і Кракаў, па-рознаму захавалі сваё значэнне. Дапамаглі ім, мабыць, рэкі, так як і згаданым Ваўкавыску, Слоніму ці Шклову. А з Кнышэвічамі магло адбыцца тое ж, што і са Страдавам, перасталі яны быць грамадскім цэнтрам. А калі так, то і місіянеры новай веры не надта дурылі сабе галаву тамашнімі аб'ектамі старога культу, асабліва тады, калі яны вельмі нагадвалі новыя сімвалы; хапіла іх толькі пераназваць без патрэбы неафіцкага разбурвання ці закопвання.

Каля Гаркавіч

Каго магла прадстаўляць каменная фігура, што захавалася каля Кнышэвіч? Не мог быць гэта Святавіт, аднак можна меркаваць, што яна была прысвечана Перуну, галоўнаму на нашай тэрыторыі дахрысціянскаму богу. Нашы продкі ўяўлялі яго сівавалосым волатам, трымаючым у адной руцэ лук-вясёлку, а ў другой стрэлы-маланкі; фігура каля Кнышэвіч адпавядае гэтаму ўяўленню. Яго назву этымолагі выводзяць ад „фаргуні" — гоцкай назвы гары і ад „пэруна" — хецкай назвы скалы. У балцка-славянскай культавай прасторы Пярун лічыўся ўладаром высотаў (неба і гор) ды атмасферных з'яў (грому і дажджу), ад яго залежаў плён сялянскай працы. У час працяглай сушы сяляне збіраліся ў густым лесе або на ўзгорку і ахвяроўвалі яму чорнае цяля, чорнага казла і чорнага пеўня, просячы дажджу; такім чынам Пярун лічыўся яшчэ і богам ураджайнасці. Быў гэта добры бог, які праганяў ад людзей нячыстыя сілы...

Наведаў я яшчэ і старадаўнюю некраполію каля падказаных мне археолагамі Гаркавіч, якую тамашнія жыхары называюць могілцамі. Яна таксама на ўзгорку за вёскай, аднак апрача пастаўленых у большасці вертыкальных камянёў іншых аб'ектаў там няма. І стоячы на тых могілцах я рашаў дылему, куды мне далей адтуль падацца. Прывабіў мяне недалёкі купал юраўлянскай царквы...

Царква ў Юраўлянах прыгожая звонку і захацелася мне яе сфатаграфаваць. Паколькі абведзена яна высокім мурам, зайшоў я на цвінтар, які дадаткова вабіў яшчэ залацістым асеннім дыванам. Гэты прыгожы лісцевы насціл ляжаў на акуратна абкошанай вакол царквы прасторы. А за ёю, у неабкошаным месцы бліжэй муру, з засохлай восеньскай травы паказалася мне каменная фігура ў кшталце крыжа, недзе пад метр вышыні. Але і яна, аброслая мохам, больш чым крыж нагадвала плюшавага мішку. І тут, сама побач царквы, зноў прыйшлося мне засумняваццa, ці гэта хрысціянскі, ці язычаскі сімвал...

Сімвал крыжа намнога старэйшы за хрысціянства, з якім мы цяпер яго асацыіруем. У старажытнасці выявы крыжа шырока ўжываліся для арнаментацыі. Але ў той час крыж меў таксама сімвалічнае значэнне. На Усходзе лічыўся ён сімвалам агню, увасабленнем вытворчай сілы, містычным прадстаўленнем бога буры ў арыйскім пантэоне. У старажытных егіпцян гарызантальная лінія крыжа атаясамлівалася з жаночым, зямным пачаткам, вертыкальная — з нябесным мужчынскім. Аб'ядноўваючы гэтыя два пачаткі, крыж лічыўся сімвалам жыцця. Надпісы ў заходнеіндыйскіх пячорах пачыналіся або канчаліся гэтым знакам. Этрускі і грэкі ставілі выяву крыжа на урнах сваіх нябожчыкаў; быццам завяршалі жыццё крыжам, быццам падаючы нам узор...

Саламон калісь сцвердзіў, што ўсякае новае гэта толькі забытае старое. Сёння найпрыгажэйшым горадам у свеце лічыцца Рыо-дэ-Жанейра, а яго сімвалам з'яўляецца пастаўленая ў 1931 годзе на гары Каркаваду агромная крыжападобная статуя Хрыста Збавіцеля. І падумаў бы хто з нас, следам за слаўным Астапам Бендэрам, што нашы пахілыя Кнышэвічы з прымітыўна абробленай каменнай фігурай гэта не моднае Рыо-дэ-Жанейра з вяршыняй пейзажнага арт-дэкору. Аднак бывае, што за простай формай можа скрывацца багаты змест. Што наша хата не так цалкам з краю...

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

http://lyczkowscy.at.tut.by ЛЫЧКОЎСКІЯ

Кажуць, што ў Японіі людзі аб сваіх продках ведаюць амаль усё. Лічыцца непрыстойным, калі чалавек з цяжкасцю можа згадаць сваіх дзядоў-прадзедаў ад дзесятага калена. Але Далёкі Ўсход, гэта не Цэнтральная Еўропа, дзе жывуць, прынамсі, беларусы. Наша нацыя, з большага, абыякава ставіцца да таго, хто менавіта жыў і якія падзеі адбываліся на яе зямлі, мяркуючы, што гэта справа выключна гісторыкаў і розных там „кніжна-архіўных чарвей". З таго і распавесці, адкуль мы ёсць і хто нашы продкі, здолее добра калі кожны дваццаты.

Праўда, лічыць усіх беларусаў іванамі, што не помняць роднасці не выпадае. Ёсць і сярод нас тыя, каму цікава і сваё паходжанне, і тыя падзеі, якія адбыліся пры жыцці іх далёкіх і не надта продкаў. Адным з такіх прыкладаў ёсць сайт http://lyczkowscy.at.tut.by.

Калі зважаць на данае прозвішча, то трэба прызнаць, што яно досыць распаўсюджанае як на колішніх абшарах Вялікага княства Літоўскага, так і першай Рэчы Паспалітай. Таму праца, праведзеная даследчыкам сваіх каранёў Юрыем Лычкоўскім, заслугоўвае не толькі павагі, але і дае рэальны шанц многім, хто мае такое прозвішча, дакрануцца да сівой даўніны праз лёс сваіх родаў.

Сайт носіць назву „Генеалогія Лычкоўскіх". Выглядае даволі прывабна — наверсе выяўлення круціцца гэтае прозвішча пададзенае па-беларуску і па-польску. Дарэчы, сайт шматмоўны. Акрамя беларускай тут ёсць польская, руская і англійская версіі, а таксама беларускамоўная версія, дзе выкарыстана лацінка.

На галоўнай старонцы размешчана карта свету, з чаго трэба разумець, што аўтар партала разлічвае, што плён яго працы будзе цікавым людзям па ўсёй планеце. „Гісторыя Лычкоўскіх падобная да лёсу бальшыні беларускіх шляхецкіх фаміліяў, — мяркуе даследчык у расповедзе аб праекце. — Таму, калі вы знойдзеце тут сваё прозвішча, магчыма і ў вас узнікне і заахвочанасць, і патрэба дазнацца гісторыі свайго роду. Калі тое здарыцца, я палічу свой сціплы праект недарэмным".

Выйсці да рубрык сайта размешчаны як мае быць злева і справа. Большасць з іх будуць цікавыя, зразумела тым, хто носіць прозвішча „Лычкоўскі". Усе старонкі падзеленыя на носьбітаў гэтага прозвішча, якія мелі калісьці ўласныя гербы альбо не мелі такіх. Думаю, прыемна было б нечакана даведацца, што ён мае не абы-якое, але шляхецкае паходжанне і да таго ж поўнае права выкарыстоўваць выяўленне, якое вісела калісьці на брамах замка яго высакародных продкаў.

Цікавымі, але не надта зразумелымі падаюцца старонкі, дзе графічна прадстаўлены радаводы Лычкоўскіх таго ці іншага герба. Аўтару варта было б узяць пад увагу тое, што пэўна не ўсе з лёгкасцю могуць зразумець ягонае прадстаўленне аб генеалагічных дрэвах.

Вялікую цікавасць выклікаюць разнастайныя карты паветаў, выйсці да якіх размешчаны з правага боку выяўлення. Усе гэтыя паветы існавалі выключна на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з чаго трэба разумець, што прарадзімай Лычкоўскіх усяго свету былі менавіта беларускія землі.

Канешне, далёка не кожнаму хопіць зацікаўлення і імпэту правесці такую вялікую даследчыцкую працу па „раскопванні" сваіх каранёў, якую здзейсніў аўтар праекта. Але намаганнямі менавіта такіх рупліўцаў да беларусаў вяртаецца гістарычная памяць.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Як люстэрка жыцця

2006 год быў адзначаны для беларускага спорту не толькі перамогамі і паразамі, рэкордамі і нізкімі вынікамі, медалямі і апошнімі месцамі. У ім, як і ў агульным жыцці краіны, хапіла ўсяго. У пэўным сэнсе спорт — гэта адлюстраванне нашай рэчаіснасці. Калі казаць пра агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнага спорту, то яны наўпрост звязаныя з эканамічным і ідэалагічным развіццём Беларусі. І, калі, прыкладам, развіццё хакея робіцца прыярытэтным дзяржавай, то гэтаму віду адпаведна даецца добрае фінансаванне. Таму і ёсць пэўныя поспехі ў беларускага хакея ў мінулым годзе — 6-е месца на чэмпіянаце свету, выхад „Юнацтва" ў паўфінал кантынентальнага кубка, стабільны нацыянальны чэмпіянат, у які просяцца ўкраінскія і латвійскія клубы. Падтрымваецца дзяржавай праз мясцовую ўладу і буйныя прадпрыемствы, хоць і ў меншай ступені, футбол. Праўда, поспехаў там куды меней. А вось, што датычыць іншых гульнёвых відаў, то яны знаходзяцца амаль у гаротным стане. Поспехі айчыннага гандбола, баскетбола і валейбола засталіся ў гісторыі, каманды не маюць трывалага бюджэту, трымаюцца пераважна на энтузіязме і таленце асобных людзей. А здольныя дзяўчаты і хлопцы ў амаль дзесяцімільённай краіне не перавяліся. Толькі з'язджаюць яны за мяжу надзвычай рана, не паспеўшы саспець і сфармавацца патрыётамі сваёй краіны. А пасля прымаюць грамадзянства іншых краін і выступаюць за іншыя зборныя. Тым больш прыемнымі былі лакальныя поспехі баскетбалістак і гандбалістак.

Празмерная дзяржаўная апека часам шкодзіць развіццю асобных відаў спорту. Прыкладам, беларускі біятлон, федэрацыю якога ўзначальвае кіраўнік самага магутнага ведамства — КДБ, перажыў у 2006 годзе шэраг скандалаў і страсанняў. Вынікі таго пакуль адмоўныя — пакрыўджаныя ветэраны, адзін з іх — алімпійскі прызёр Аляксей Айдараў цяпер выступае за Украіну, некаторыя закончылі выступы (Вадзім Сашурын, Уладзімір Драчоў, Алег Рыжанкоў), іншыя ў падвешаным стане (Алена Зубрылава). З маладых жа адкрылася толькі адно новае імя — Кацярына Дамрачова. Падобныя стрэсы перыядычна перажывае і беларускае плаванне. Вынік — ад'езд за мяжу дзвюх выдатных плыўчых. Адна з іх, Алена Попчанка, выдатна праявіла сябе на апошнім першынстве Еўропы.

Хто насамрэч парадаваў у 2006 годзе, дык гэта фрыстайлісты, якія ўвесь час падвышаюць гонар за Беларусь. Але і тут не абышлося без няшчасця. На апошнім этапе Кубка свету Дзмітрый Рак упаў так, што атрымаў вельмі цяжкую траўму. Ужо дзесяць дзён ідзе змаганне за жыццё маладога чалавека (на момант напісання гэтых радкоў ён па-ранейшаму знаходзіўся ў коме). Хочацца тут згадаць пра беларускага барца Дзмітрыя Дзябелку, які быў прызёрам алімпіяды, а пасля пакінуў спорт.

А яшчэ ў памяці адклаліся дысквалiфікацыі, якія перыядычна спасцігаюць спартоўцаў розных краін. З нашых у 2006 годзе ад іх пацярпелі канькабежка Анжаліка Кацюга, якую не дапусцілі да зімовай алімпіяды (на маю думку, несправядліва) і штангіст Генадзь Аляшчук, які папаўся на допінгу другі раз і цяпер дысквалiфікаваны пажыццёва.

І ўсё ж станоўчых вынікаў было куды больш, пра што расказвалася ў „Ніве" цягам года. „Мы верым цвёрда ў герояў спорта" — радкі з гэтай савецкай песенькі калісьці былі надзвычай папулярнымі ў народзе. Толькі давайце верыць не ў герояў, а ў фізічную і духоўную моц звычайных спартоўцаў. Хочацца, каб яны змагаліся на чэмпіянатах і турнірах чэсна і годна, былі сапраўднымі патрыётамі і сваімі выступамі кшталтавалі нацыянальны гонар.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пражылі разам 67 гадоў

У Трасцянцы пад нумарам 152 стаіць прыгожая драўляная хата. Яна ўся аздобленая ажурнымі майстэрска выразанымі драўлянымі карункамі, асабліва на навугольніках. Другую такую цяжка знайсці ў вёсцы, хоць усе жыхары дбаюць тут пра свае сядзібы. Таму наша вёска такая прыгожая. Нярэдка замежныя турысты тут затрымліваюцца і пстрыкаюць фотаапаратамі.

Вольга і Міхал Ваўранюкі (справа) за гасцінным сталом

У згаданай хаце, што стаіць тут з 1934 года, жывуць Вольга і Міхал Ваўранюкі, сужонства ад 1939 г. Дзедка Міхал, народжаны ў 1914 годзе як наймалодшае дзіця Васіля і Наталлі, не памятае бежанства. Яго бацькі вярнуліся ўжо ў 1918 годзе і адразу ўзяліся гаспадарыць. Іхнія старыя будынкі ацалелі. Трэба было пракарміць сям'ю — сына і тры дачкі. Міхал хадзіў у школу з 8 па 12 год і скончыў толькі 3 класы.

З 8-мі гадоў ужо вадзіў коней на начлег, —успамінае,— а з 12 гадоў мусіў брацца за плуг, бо тата парэзалі за маіх сёстраў хлопцы. Чуць адратаваў яго заблудаўскі доктар Нялепка. Доўгія гады бацька мучыўся і даходзіў да сябе. А пасля шасці гадоў недалёка вёскі Янова Нараўчанскай гміны здужаў загатовіць зімою дрэва на новую (гэтую) хату. Там тата начаваў, а вясною тое дрэва сплавіў пад Трасцянку. А тут ад рэчкі трэба было павазіць. Мне было тады ўжо 18 гадоў і мы з татам рэзалі дылі на новую хату. Вядома, рэзалі ўручную. Калі паставілі новую хату — старую прадалі. Сёстры павыходзілі замуж, а потым ажаніўся я. У нас пайшлі дзеці — Ваня і Люба нарадзіліся за немца, а малодшыя — Маня і Вася — ужо пасля вайны. У апошні фронт згарэлі ў мяне 2 клуні і ўсе хлявы, нават хата загарэлася, але здолелі загасіць. Трохі толькі абгарэла з аднаго боку. Так, што хата ацалела.

І зноў гадуючы чацвёра дзяцей трэба было ўлажыць і час, і сілы, каб загатовіць дрэва на клуню і хлявы. Цэлае лета ў полі, а цэлыя зімы ў лесе. А тата мой памёр пры немцах. Добра, што мая жонка Оля была працавітай жанчынай і як магла, так мне памагала, а потым памагалі дзеці. А я ўсё жыццё цяжка працаваў на сваю сям'ю, так як калісьці мой тата. Бо мой тата даражыў гаспадаркаю. І нікога не баяўся, хоць партыйцы прыходзілі мяне страшыць, што гаспадарка мая пойдзе пад дзяржаву, бо нічога не кантрактую і ў калгас не пішуся.

У сямідзесятыя гады, як многія мужчыны з Трасцянкі я падаўся працаваць качагарам у Беласток. Працаваў 10 гадоў. З тае работы я пайшоў на пенсію, а потым жонка дастала пенсію за зямлю. Усе нашы дзеці і ўнукі жывуць у горадзе. Хату мы перапісалі на наймалодшага сына Васю. Некалькі гадоў таму сын аднавіў не толькі хату, але і агароджу. Зрабіў новы дах і драўляную шалёўку. Захаваў і аднавіў старыя ўпрыгожанні, так што будынак не страціў свайго характару. І вокны засталіся драўляныя з аканіцамі такімі ж белымі, як і былі.

Дзеці і ўнукі часта адведваюць сваіх старэнькіх бацькоў і дзеда і бабкаю. Ладзяць ім святы і юбілеі ды жадаюць яшчэ многа лет у здароўі. Да таго далучаецца аўтарка гэтага допісу.

РУТА

Новы расклад язды

Ад 10 снежня ПКП увяла новы расклад язды. Чым гэтым разам парадавала Падляшскае прадпрыемства рэгіянальных перавозаў сваіх кліентаў? На жаль, ніякіх навінак няма. Адно пэўнае, што з карты чыгуначнага транспарту зніклі чарговыя цягнікі. Перад увядзеннем новага раскладу язды кожны раз праводзіцца грамадская кансультацыя, пасля якой мясцовыя самаўрады, як і ўстановы пасылаюць свае прапановы Маршалкоўскай управе. У Чаромсе гэтая справа абмяркоўвалася на XXIV сесіі Рады гміны, якая праходзіла 25 кастрычніка. Паколькі справа чыгункі выклікае шмат рознагалоссяў, на пасяджэнне прыйшло шмат зацікаўленых справай жыхароў пасёлка. Маршалкоўскую управу прадстаўляў Генрык Тачыдлоўскі з Дэпартамента інфраструктуры і аховы асяроддзя, які адказвае за транспарт у Падляшскім ваяводстве, а Прадпрыемства рэгіянальных перавозаў — Януш Казбярук, кіраўнік секцыі ў Чаромсе. Удзельнікі сустрэчы амаль дзве з паловай гадзіны спрачаліся, а старшыня чаромхаўскага Агульнапольскага таварыства „Прыязны транспарт" Надзея Сулімма прад'явіла многа заўваг да раскладу. Усе заўвагі зводзіліся да адной канстатацыі: расклад язды не адпавядае спадзяванням грамадства і служыць партыкулярным інтарэсам перавозчыка. Паколькі на пасяджэнні не прысутнічалі кампетэнтныя начальнікі — віцэ-маршалак Ян Камінскі з Маршалкоўскай управы і Роберт Навакоўскі, дырэктар Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў — дык чарамшане вымушаны былі задаволіцца адказамі спадара Тачыдлоўскага, які сказаў: „Маршалкоўская ўправа карыстаецца абмежаванымі фінансавымі сродкамі ў якасці датацый для рэгіянальных перавозаў. Сёлета атрымалі мы дзевяць мільёнаў злотых на гэтую мэту. Перавысілі мы ўжо ліміт на шэсцьдзесят мільёнаў. На 2007 год прызначаецца 10,5 мільёна зл., што пакрывае толькі кошт 69 лакальных рэйсавых паяздоў. На больш няма грошай. На сённяшні дзень 50% затрат прадпрыемства складаюць рэгіянальныя перавозы. Прадбачваецца, што Маршалкоўская ўправа ў 2007-2013 гадах атрымае з Еўрасаюза 100 мільёнаў зл., але з тых сродкаў не плануецца мадэрнізацыя чыгункі. Павышаюцца кошты абслугі рэйкавых аўтобусаў, утрымання чыгуначных ліній, што практычна абазначае немагчымасць павелічэння колькасці рэйсаў. А сумежныя з намі Мазавецкае ды Вармінска-Мазурскае ваяводствы не саўдзельнічаюць у датацыі лакальных ліній на сваёй тэрыторыі. Мы ствараем расклад язды не пад патрэбы кліента, а толькі дапасоўваем да бюджэту".

І маем тое, што маем. На лініі Гайнаўка — Чаромха — Седльцы адмянілі два цягнікі зранку. Каб дабрацца з Чаромхі ў напрамку Седльцаў ці Варшавы, трэба ехаць першым цягнікам а 4.18, бо наступны будзе аж у 12.21. Чарамшане прапанавалі дадаткова два цягнікі ў Седльцы ў 5.45 і 8.50. Маршалкоўская ўправа адмоўна паставілася да прапановы, паколькі не хацела даплачваць да амаль шасцідзесяцікіламетровага адрэзка па-за межамі ваяводства на лініі Франолуў — Седльцы.

Гэтая справа тычыцца і цягнікоў у адваротным напрамку Седльцы — Чаромха — Гайнаўка. Першы цягнік ад'язджае а 7.40, затым ад'язджае „Жубр" (Варшава-Заходняя — Гайнаўка) у 8.25., але гэты апошні курсіруе адно ад 30 чэрвеня да 31 жніўня. Наступны цягнік будзе ў 16.45. Кандуктары з Чаромхі гаварылі мне, што адмененыя цягнікі ў Седльцы заўсёды былі запоўнены і давалі найбольш прыбытку. Аднак адным можна цешыцца, што новы расклад вырашыў урэшце праблему на лініі Чаромха — Беласток. Запісаныя шэсць пар цягнікоў курсіруюць нармальна. І так з Чаромхі ў Беласток ад'язджаюць: а 4.32, 5.32, 6.34, 9.50, 13.48, 16.58. У адваротным напрамку адпаведна: 6.47, 10.07, 14.07, 15.57 і 19.17. Аднак ПКП Рэгіянальныя перавозы суполка з а.а. пакідае за сабой права ў любы час уводзіць змены. На практыцы гэта абазначае, што могуць быць адмененыя чарговыя цягнікі.

Уладзімір СІДАРУК

Пажаданні

Пажаданні ў Новы год
Я з Бялкоў вам пасылаю.
Хай краіну беражэ
Хто ў ёй пражывае.

Нашы родны берагі
Ўсіх хто з намі сувязь мае,
Гэты край нам дарагі —
Тут айчыну сваю маем.

Хай літовец, беларус,
Ром-цыган ці ўкраінец
За сваё няхай стаіць,
Мовы роднай не пакіне.

Ад вякоў тут пражываем,
Надалей тут будзем жыць,
Ганарымся гэтым краем,
Ён нам вельмі дарагі.

Яшчэ раз усім жадаю
Каб шчаслівыя былі,
Ніколі гора не спазналі,
Толькі ў радасці жылі.

А ўсім дзеткам я жадаю,
Каб вясёлымі былі
І бацькоў не забывалі
У асеннім іх жыцці.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

ПАТЭЛЬНЯ

Гэта было яшчэ пры санацыі. Адзіны сын багатых бацькоў ажаніўся з прыгожай і здаровай дзяўчынай. Спачатку было ў іх усё як трэба: спакой, мір і любоў... Аднак з часам нешта парвалася, бо пачаліся сваркі і дайшло да бойкі паміж бацькам і сынам. Бацька стаў адужваць сына і латашыць яму бакі. А нявестка не драмала і калі ўбачыла, што цесць бярэ верх над яе мужам, нядоўга думаючы ўхапіла з пліты цяжкую чыгунную патэльню, якая

помніла яшчэ часы панавання імператара Аляксандра I, і са смакам урэзала старога па мазгаўні, што аж ляск пайшоў па хаце. Той ойкнуў па-свойму, але выстаяў на нагах. Калі дастаў чарговы гасцінец па галаве, то ўжо па-жыдоўску прастагнаў ой-вэй і аж пакланіўся перад сынам; мо тады яму ў вачах мурашкі па агні забегалі. Але ж кажуць у народзе, што Бог Тройцу любіць; дык і нявестка трэснула старога трэці раз, і то так, што аж з паліцы нешта ўпала. На гэты раз цесць упаў на калені і стаў нешта балбатаць па-нямецку. На дапамогу яму паспяшыла старая цешча, але і яна дастала жару ад нявесткі, толькі цяпер абышлося без патэльні.

З гэтай пары ў хаце запанаваў спакой, а калі часам ішло да дрэннага, тады стары цесць прыпамінаў „нямецкія" словы і зноў вяртаўся лад у сям'ю.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Ніва у падпісцы Ніва у падпісцы Ніва у падпісцы Ніва у падпісцы Ніва

odcinek dla wpłacającego
zł ..... gr .....
słownie złotych
groszy jak wyżej
wpłacający .....
dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....
Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504
Datownik
podpis przyjmującego
Opłata
zł .....

odcinek dla posiadacza rachunku
zł ..... gr .....
słownie złotych
groszy jak wyżej
wpłacający .....
dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....
Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504
Datownik
podpis przyjmującego
Opłata
zł .....

odcinek dla poczty/ banku
zł ..... gr .....
słownie złotych
groszy jak wyżej
wpłacający .....
dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....
Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504
Datownik
podpis przyjmującego
Opłata
zł .....

odcinek dla banku
zł ..... gr .....
słownie złotych
groszy jak wyżej
wpłacający .....
dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....
Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504
Datownik
podpis przyjmującego
Opłata
zł .....

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środk., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Наклад: 15 000 egz.

Суседскія былі

КАЦІНЫ КАТ

Здавалася, што Сцяпан Занкавец нейкім патаемна-магічным, трэцім, як у індуісцкага бога Шывы вокам, заўважыў праз бетонныя сцены і жалезныя дзверы, што я збіраюся выходзіць на вуліцу. Прычым на дзве хвіліны раней, чым я надумаўся гэта зрабіць. І як толькі я адчыніў дзверы свайго пад'езда, ён ужо заканчваў свой знакаміты выступ пра тое, што ўжо пайшлі другія суткі як ён кінуў піць, уладкаваўся на працу і зараз просіць даць яму пару купюраў нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь выключна на хлеб для хворай жонкі, якая таксама кінула піць у знак салідарнасці з ім.

— Эх, Сцяпан! — кажу. — Няўжо ты думаеш, што штодзённыя аповеды пра замену твайго абедзеннага рацыёну з алкаголю на хлеб у гэтым мікрараёне гучаць аж настолькі пераканаўча, што ўсцешаныя суседзі з удзячнасцю хатняга сабачкі пароды чыхуахуа змешанага з той-тэр'ерам будуць бясконца працягваць фінансаваць твой падпад'ездны выступ.

Пасля маіх слоў на твары Занкаўца сталі адбывацца нейкія незразумелыя генетычна-мутантныя змены. Яшчэ ўчора я думаў, што счарнеўшы ад ужывання празрыстай вадкасці Сцяпанаў твар больш пацямнець ужо не можа. Ды памыліўся. Твар колеру ўрадлівай зямелькі Магілёўскай вобласці стаў як толькі што асушаны кавалак палескага балота.

— Эх, сусед! — у роспачы прастагнаў Занкавец. — Шкада грошай — не давай. Але смяяцца з гора бедных не трэба. І хатніх жывёл прыплятаць да таго, што я алкаголік, таксама не зусім этычна для чалавека, які і сам любіць выпіць, і звяроў тых, як нармальны вясковы перасяленец, у гарадской кватэры не трымае.

— З чаго ты ўзяў, што я смяюся? — разгубіўся я. — І ў думках не было!

— Праўда?! — бліснуў нясмелы промень святла на Сцяпанавым анфасе. — А то я з тае бяды падумаў, што зноў мяне тым катом папракаюць. Злыя людзі ў нас жывуць, скажу я табе папраўдзе. Злыя і гадкія. Душагубам мяне называюць, шкуралупам, катовым катам. А чаго? Без дай прычыны! Нават гаспадар таго ката ніякіх прэтэнзій да мяне не мае. Наадварот, задаволены. Кажа, што я найлепшы дрэсіроўшчык хатняй жывёлы ў свеце.

— То ж я гэтай гісторыі ўвогуле не ведаю, — заінтрыгавала мяне. — Ты мне лепш пра ката раскажы, а не тую маму, дзе ты штодзень кідаеш піць. Калі цікава будзе, на піва гарантую.

— Ну то слухай! Толькі з півам не падмані! — узбадзёраны надзеяй на доўгачаканую пахмелку ажывіўся Занкавец. — Летась неяк заходзіць да мяне Генка Сасімовіч. З трэцяга паверха. Ведаеш ты іх, зладзеяў. Ён на мясакамбінаце нейкі начальнік. З той работы і нажыўся, брыда. На грашах спіць і грашамі накрываецца. І жонка яго, фіфа, кіпцюры нафарбавала як у фільме жахаў. Цьфу, брыда! Глядзець агідна. Яна там жа нейкай канторскай сцервай падпрацоўвае. Не мелі яны куды грошы дзець, то надумаліся за мяжу адпачываць паехаць, як быццам бы там гарэлка таннейшая. Ды што з дурняў возьмеш, акрамя аналізаў. Ну, а ката свайго не ведалі куды дзець на гэты тэрмін. Прыйшоў да мяне той каціны тата і давай смаркацца. Дагледзь ката, просіць. Вось такі гад! Як на піва, то ў яго не выкленчыш. А як што трэба, то да мяне ляціць. Сцяпан, тады, Сцяпан! Выходзіць, што без Сцяпана нікуды. А я, чалавек незлапамятны. Добры я. Пагадзіўся. Дагледжу, кажу, твайго мышаеда. А ягоная фіфа праз плечы ўжо лямантуе. Маўляў, наш коцік мышэй не есць і іх у вочы не бачыў. Мы, кажа, яго толькі паляндвічкай кормім, і абавязкова свежанькай. Іншай наш Васечка нават не нюхае. Васечка — гэта яна на ката. Уяўляеш, да чаго дадумаліся! Катам імёны даваць сталі. Хутка, хіба, і пашпарты выдаваць пачнуць. Зусім пашалелі, брыдоты. Гадка нават глядзець на такіх людзей.

Грошы на мяса далі, тут нічога не скажу. Што праўда — то праўда. І шмат. Ты не паверыш! — тут Сцяпан хацеў хапіцца рукамі за галаву, але рукі не паслухаліся гаспадара. Адна слізганула па ілбе, а другая крыху прычасала патыліцу. — Людзі не зарабляюць столькі, колькі ў іх кот з'ядае! Ну і паехалі сабе адпачываць. А да мяне іншы сусед прыйшоў, Скапец, таксама Васька, як той кот. Ну мы з гэтым Васькам і ўбіліся ў грошы на ката. Якая розніца, думаю, якога Ваську карміць. Гэты нават менш есць. Праўда п'е, барані Божа! Як цэмент ваду. Толькі налівай. Гарэлка ідзе як у сухую зямлю. А як грошы скончыліся, Скапец пенсію атрымаў. Зноў крыху загулялі. Пра ката зусім забыліся. Ды і хто ён такі, каб пра яго людзі помнілі. Ён, што, карысць якую тут, у горадзе, прыносіць? Не! Зусім непатрэбная жывёла. Толькі жарэ, спіць і сам ведаеш... Прыбірай пасля за ім.

Праўда, за гэтым катом прыбіраць не прыйшлося. Хіба ён і сваё паскудства таксама з'еў, бо прыляцела фіфа да мяне і давай скандаліць. Кажа, што я грошы ўзяў, а ката не карміў. Маўляў, іх бедны Васечка ўсіх мух пералавіў у хаце і нават лупіны ад сырой бульбы, што ў сметніцы былі, усе паеў. І запіваў, сцвярджае, вадой з унітаза. А Генка дык наадварот. Дзякуй, кажа, табе Сцяпан. Нарэшце хоць хто жончынага любімчыка надрэсіраваў так, што той стаў вегетарыянцам. Бо ад гэтага ката пакою ў хаце не было, на галовы людзям скакаў. А зараз, дадуць скарынку хлеба, ён і задаволены.

Сцяпан глянуў прама мне ў вочы, каб стала зразумелым, што аповед ён закончыў, а піва яшчэ не выпіў. Не ведаю як бы зрабілі вы, але я, ад душы пасмяяўшыся, даў яму аж на два куфлі. А той так узрадаваўся, што з удзячнасці вырашыў расказаць гэтую гісторыю да канца.

— Недзе праз тры дні, — перайшоў ён на шэпат, — фіфа на работу пайшла і прынесла дахаты вялікі кавалак мяса для ката. Той з галадухі так накінуўся на ежу, што еў без перастанку, пакуль не здох. Ну і добра. Не трэба было мяса яму даваць. Хай бы ўжо і заставаўся, як казаў Генка, вегетарыянцам. А Сасімовічы, цяпер, можа хоць менш мяса стануць красці на рабоце.

Віктар САЗОНАЎ

2007 год

Баран (21.03. — 19.04.) Поспех у галінах, з якімі дагэтуль ты цяжка спраўляўся. Магчымая праца, навука за мяжой. Спрыяльныя ўмовы і людзі. Смелым шчасце пасабляе! Не цэнзуруй мараў, рэалізуй іх!

Бык (20.04. — 20.05.) Палепшыцца стандарт жыцця. Павышэнне ці добрая пасада восенню. У пары магчымая праверка пачуццяў. У цане практычны падыход і цвярозая ацэнка магчымасцей. Хтосьці высокапастаўлены паможа зрэалізаваць мары.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Вольным можа празвінець вясельны марш. А там, дзе было кепска, вырвіся з таксічнай сувязі да чэрвеня. Згода на працы прынясе вынікі. Лёгка наладжваеш кантакты. Свет любіць тых, якія любяць свет.

Рак (22.06. — 22.07.) Многа цікавых знаёмстваў, будзеш душой кампаніі. На працы карысці ад мінулага працавітага года. На свеце шмат людзей памірае ад недахопу хлеба, а яшчэ больш — ад недахопу любові. Партнёра да бізнесу сустрэнеш у незвычайных акалічнасцях.

Леў (23.07. — 22.08.) Схочаш быць цэнтрам жыцця. Адзінокім не будзеш. Можаш пакінуць старую фірму без жалю. Можаш паехаць у экзатычную краіну. Можа паправіцца стандарт твайго жыцця, дзякуючы намаганням, дапамозе, акалічнасцям. Добрае здароўе.

Дзева (23.08. — 22.09.) Схільнасць да жарсных пачуццяў. Не пакідай працы, нават калі ты ёю незадаволеная. Даведаешся, хто табе спрыяе. Знаёмствы з людзьмі іншага культурнага кола. Пад канец года можаш падумаць аб новым доме.

Шалі (23.09. — 22.10.) Цікавы, каляровы год. Мілыя прафесійныя і сяброўскія кантакты. Студзень, люты і восень — добры час выходзіць да людзей. Можаш стаць шэфам, выйграць конкурс. Добрыя заробкі. Можаш смела ехаць за хлебам далёка.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Змена прафесіі, незвычайнае павышэнне; акапаешся на здабытых пазіцыях. Пагодзішся з непрыяцелем. Аформіш цяжкую службовую справу. Можаш раптам выйграць на латарэі. Пад канец года паявіцца мэта вартая выдаткаў.

Стралец (22.11. — 21.12.) Магчымы шлюб ці гарачае каханне. Сёлета ты выбраннік лёсу! — раз на 12 гадоў! Маланкавыя поспехі. Зробіш інтарэс жыцця на сваім таленце. Адкрытыя шляхі да багацця і славы.

Казярог (22.12. — 19.01.) Канчай нявартыя нічога сувязі. Хай твой шлях не будзе штодзённа „дом — праца — дом". Вера ў сябе дадасць табе крылаў. У новых інтарэсах шукай замежных партнёраў. Будзеш добрым суддзёй і дарадчыкам.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Будзеш на пазіцыі пераможцы — ажыццявіш кожны план. Можаш здабыць славу і прызнанне нават на міжнароднай арэне, асабліва пасля верасня.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Ненайлепшы час знайсці партнёра на ўсё жыццё; скінь ружовыя акуляры. Спраўся з фінансамі і паперамі — восенню будзе магчымасць добрай інвестыцыі ці паездкі. Будзь верным. Не пазычай. Не спрачайся з чыноўнікамі і шэфам.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. у полі не воін, 2. служыцель культу ў яўрэйскай рэлігійнай абшчыне, 3. спецыяліст па падводных работах, апрануты ў воданепранікальны касцюм, 4. наступнік Клінтана, 5. раённы цэнтр на поўнач ад Ліды, 6. вымяраецца ў тыднях, 7. вязкі асадак на дне вадаёмаў, 8. гончы сабака, 9. шэраг малітоўных прашэнняў святара ад імя вернікаў, 10. наступнік Мітэрана, 11. дрэва хвоі, 12. палетак з цыбуляй і буракамі, 13. агародная расліна, якая выклікае слёзы, 14. вясельны абрадавы пірог.

(Ш)



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Артура Шапенгаўэра.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 47 нумара

Гагарын, капа, язык, епархія, ячмень, айсберг, порах.

Рашэнне: **Гара пазяхае пячорай.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА ВЕЧНАЕ

Ікона прыхіляе неба

„Ты, Госпадзе, Майстра ўсяму што існуе, прасвяці і кіруй душою ды целам Тваіх слуг; вядзі іх рукі, каб маглі годна і дасканала прадставіць Твой лік, лік святой Маці Тваёй і ўсіх Тваіх святых, на хвалу радасці і прыўкрасы Тваёй царквы. Амінь". Так гучыць адна з малітваў іканапісцаў.

Мабыць, і гэтая малітва спадарожнічае шляху дасканалення вучням Іканапіснай студыі ў Бельску-Падляшскім. Гэтая школа дзейнічае ўжо адзінаццаць гадоў. Пачалося ад іканапісных лагераў у канікулы 1983 г. Цяпер гэта унікальны асяродак у маштабе краіны, Еўропы, а нават і свету. Сёння іканапіснай школе пагражае ліквідацыя.

Пасляліцэйскую Іканапісную студыю вядзе 71-гадовы айцец Лявонцій Тафілюк, народжаны ў Кленіках, у другой палове сямідзесятых старшыня Моладзевай секцыі Польскай экуменічнай рады, ад канца сямідзесятых служыў ён у Бельску-Падляшскім, духоўны айцец манахінь манастыра св св. Марфы і Марыі на Святой Гары Грабарцы. Нядаўна сарганізаваў ён вернісаж ікон, напісаных вучнямі за апошнія тры гады. Справа была не так у іх паказе, як у гэтым, каб звярнуць увагу на сітуацыю студыі. Каля двух месяцаў таму, у рамках выязной сесіі сеймавай Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей на Падляшшы яе дэпутаты азнаёміліся з сітуацыяй беларускай меншасці. Навелалі таксама школу айца Лявонція. Захапляліся іконамі, а дзейнасць студыі карысталася іх вялікім прызнаннем. Абяцалі дапамогу. Пакуль што нічога з гэтага не атрымалася. Перад вернісажам айцец паказвае „Ніве" ліст, прысланы ўжо былым падляшскім дэпутатам ад ПіС Раманам Чэпэ (у той час грамадскім упаўнаважаным Падляшскага ваяводы па справах меншасцей; сёння бурмістрам Лапаў) накіраваны прэм'еру Яраславу Качынскаму.

— Спадар дэпутат абяцаў хадайніцтва. Ды, пакуль што, ніякай рэакцыі на ягоны ліст я не атрымаў, — кажа айцец рэктар. — Наша сітуацыя да сёння не паправілася. Няма ніякіх водгукаў.

Выстава сарганізавана дзякуючы спонсару — страхавой фірме PZU „Życie". На дзейнасць школы, як пералічвае а. Лявонцій, спатрэбілася б каля 100 тысяч злотых.

— Мы тым часам стараемся самі зарабіць нейкія сродкі, хоць бы прадаючы іконы.

Гэтая сума абсалютна неабходная для асноўнага ўтрымання.

Айцец Тафілюк: — Каб пісаць іконы, апрача таленту, неабходныя: вера, цярпенне і малітва.

Ані міністэрства, ані мясцовы самаўрад па юрыдычных прычынах не ў змозе пастаянна фінансава падтрымоўваць студыю. Яна прыватная, без правоў публічнай школы. Ёсць выхад, каб самаўрад мог дапамагаць; хопіць, каб ізноў пераняў будынак школы, былую сядзібу бальніцы, а пасля дзіцячага садка. Афіцыйна, пакуль што, такой волі не было.

Навучанне ў Іканапіснай студыі працягваецца чатыры гады. Выпускнікамі з'яўляецца ўжо 37 іканапісцаў. Цяпер навучаецца 17 асоб. У сёлетнім школьным годзе па прычыне фінансавых праблем была прынята толькі адна асоба, якая пайшла адразу на другі курс. Каб сюды трапіць, трэба мець завершаную атэстатам сталасці сярэднюю адукацыю, адолець экзамен-размову на рэлігійныя тэмы і прайсці практычны экзамен, даказваючы мастацкія здольнасці. Выпускнікамі дагэтуль была ў асноўным праваслаўная моладзь. Студыю закончыла таксама адна жыхарка Чыкага (ужо памерла), якая на заняткі прылятала спецыяльна з Амерыкі. Да сёння яе ікона-трыпціх памешчана над уваходнымі дзвярамі ў школу. Вучні, апрача вывучэння тэхнік іканапісання, пазалоты і кансервацыі ікон, штудзіруюць таксама Святое Пісанне Старога і Новага Запавету, тэалогію, гісторыю Царквы і мастацтва. Вывучаюць таксама царкоўнаславянскую і грэчаскую мовы. Заняткі пачынаюцца ўжо ў 6.30 удзелам у літургіі. Малітвай таксама вершыцца дзень. Выпускнікі атрымліваюць званне тэхніка-мастака па спецыяльнасці іканаграфія ды грамату, якая ад імя Сінода епіскапаў дае ім права на выконванне іканапісных прац у праваслаўных храмах.

Іканапісаннем займаўся таксама і а. Лявонцій. Цяпер гэта робіць зрэдчас. Кіруе ён прыходам, публікуе шмат атрыкулаў і кніжак на тэму Праваслаўнай царквы. Заўжды адзначаў і адзначае, што ікона гэта свайго роду малітва.

— Я пішу менш ікон, але яшчэ ёсць столькі іншых форм малітвы!

Раней ён адзначаў:

— Не хопіць валодаць мастацкімі ўмеласцямі. Калі мы пішам ікону, сузіраем Бога.

Іканапісец гэта не звычайны мастак ці рамеснік. Каб зразумець сэнс іконы, трэба напоўніць сябе Евангеллем.

У час вернісажа падкрэсліў:

— Ікона, вядома, гэта таксама від мастацтва, ды гэта штосьці больш, чым карціна.

Ікона прыхільвае неба. Паказвае Богачалавека. Мастак не намалюе Бога, бо не ў змозе ўлавіць боскую натуру.

— Якая з ікон, паказаных на выстаўцы, вам найбліжэйшая?

— Усе яны блізкія майму сэрцу, так як Бог.

Прысутны на вернісажы намеснік бурмістра Бельска Міраслаў Галэмбёўскі, здаецца, разумеў сэнс існавання школы:

— Каб напісаць ікону, патрэбны псіхафізічны высілак, засяроджанне, веды і вера.

Іконы, напісаныя ў бельскай студыі, можна знайсці ва ўсёй краіне і ў свеце, таксама і ў падляшскім рэгіёне, напрыклад, у царкве св. Іаана ў Супраслі. Калі адкрывалася выстава, іншую яе частку прадстаўлялі ў Бухарэсце, а раней у Маскве. Калі пару тыдняў таму з вялікай помпай і ў прысутнасці тлумаў, таксама і афіцыйных асоб, адкрываўся Музей ікон у Супраслі (філіял Падляшскага музея), ніхто нават не заікнуўся аб існаванні Іканапіснай студыі, не ўспамінаючы ўжо аб яе праблемах.

— Гэта праўда, што пісаныя ў нас іконы не маюць музейнага характару, — прызнаецца, успамінаючы інаўгурацыю супрасльскага музея а. Лявонцій.

Айцец Тафілюк не адзін раз адзначаў: — Каб пісаць іконы, апрача таленту, неабходныя: вера, цярпенне і малітва.

Мабыць, якраз яны будуць патрэбныя таксама для таго, каб бельская Іканапісная студыя магла пратрымацца.

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

9 770546 196000

Тут у Вершаліне нічога ўжо няма

— Хтосьці купіў Вершалін, — уздыхае Міхась Гжыбэк. — І ўсё паразвальваў, папаліў. Труны таксама. Іконы, кажа цётка Надзя Мішчук, частку аддала ў дайлідскую царкву. Цікава, ці там яны ёсць. Цётка Надзя не ведае, што абраз Ільі Клімовіча, вядома, у Тадэвуша Слабадзянка. У яго ўсё — нават Ільіны рызы. А ікона Іаана Кранштацкага — у мяне. А пра ліст прарока Ільі са ссылкі ў Сібіры Слабадзянэк не ведаў, і добра. Бо канцэпцыя фільма змянілася б — тае *Польскай пасіі*.

Маёр Міхал Гжыбэк, у той час, калі Станіслаў Муха ставіў дакументальны фільм (160 хвілін) пра прарока Ілью Клімовіча, быў капітанам. Родам ён, вядома, з Грыбоўшчыны. А ўзялі яго як „зялёнага", кансультантам, каб паказаў, што дзе і як — ваколіцу, павадзіў па сцежках, паправіў хібы ў сцэнарыі. Як убачыў той абрыс фільма грыбаўчанскі вайсковец, які заўжды меў схільнасць да мастацтва, дык амаль не лопнуў ад смеху! Прафесійны варшаўскі сцэнарыст, не адклеіўшы задніцы ад свайго крэсла, накрэмзаў сваю ўяву пра Беласточчыну, беластоцкае праваслаўе, беларусаў. А фільм здымалі... немцы. Падкрэсліў тыя дурноты грыбаўчанін, натлумачыўся гэтым прафесіяналам. Станіслаў Муха родам з Кракава, шмат гадоў працуе ў Нямеччыне. Рэалізаваў некалькі фільмаў на тэму экзотыкі Падляшша, м.інш. „Ліннік" (пра *прарока тэхнікі* Паўла Валошына, будаўнічага Вершаліна), сустрэў яшчэ жывых ільінцаў. Вярнуўся яшчэ раз на Падляшша год пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза і паставіў фільм *Reality Shock*, які ў крывым люстры паказваў эмоцыі людзей пагранічча пасля ўваходу ў ЕС. У *Польскай пасіі* рэжысёр прабаваў пайсці слядамі памяці пра Ілью Клімовіча, рэканструяваць грамадскі і палітычны фон, які спрычыніўся да ўзнікнення рэлігійнай плыні ў Грыбоўшчыне, бунту супраць Царквы. Ставілася пытанне: што сталася з Вершалінам у матэрыяльным і духовым маштабе пару дзесяткаў гадоў пазней. Жывыя прыхільнікі і паслядоўнікі прарока Ілы расказваюць пра відзежы, якія паказалі ім шлях, прызначэнне, якое патрабавала ад іх штодзённага сведчання духа.

Фота МІХАЛА ГЖЫБКА

Такія іконы з прарокам Ільёй можна сустрэць яшчэ па вёсках Беласточчыны. Міхал Гжыбэк у доме Клімовіча

Вершалін быў для адных, напрыклад, бацюшкі Савіча з прыхода ў Востраве, да якога належала Грыбоўшчына, месцам нараджэння найгоршай ерасі: назначання простых мужыкоў у евангелістаў, святых, прарокаў, ды звычайнай маны пад маркай святых абрадаў, а для іншых — месцам тайнай містэрыі, цэнтрам свету, Новым Іерусалімам. Ілья Клімовіч убачыў быў у сне царкву, якая вырасла ў ягонай Грыбоўшчыне. На купленым кавалку зямлі пачаў быў пабудову Божага Дому, цягам дзесятка з лішнім гадоў сталі называць яго прарокам, што павялічыла ягоную касу і дазволіла завяршыць будову храма. А калі вернікі вырашылі яго распяць, прачнуўся з летаргіі і ўцёк. Кажуць, схаваўся ў бульбяным доле. У вёсцы застаўся толькі крыж, які чакае новага Збавіцеля. Для патрэб гэтага фільма (зайграў ён і ў наступных) пастаўлены быў новы крыж. Прадбачаны Ільёй хуткі канец свету не наступіў, прыйшлі саветы. Узнагароджаны медалём Пілсудскага Ілья Клімовіч прапаў на сібірскіх прасторах. Былі весткі, што яго расстралялі саветы, іншыя — што жыве. Прыйшоў быў ад яго ліст з катаргі, з падзякай за падтрымку грыбаўчан. Гэты ліст не трапіў у рукі Тадэвуша Слабадзянка.

Фота МІХАЛА ГЖЫБКА

Ежы Трэля іграў у фільме „Цар Мікалай" Ілью Клімовіча. Тут у Паўднёвым Востраве распытвае Паўла і Соню Чыжэўскіх пра прарока

— Тадэвуш Слабадзянэк, можа, уратаваў легенду Ілы Клімовіча, а, мабыць, перакуліў, на чым свет стаіць! — кажа Міхал Гжыбэк.

Вершалін перанёс вытрымку часу дзякуючы адкрыццю яго антраполагам Уладзімірам Паўлючуком, які яшчэ быўшы журналістам у „Ніве" ў сямідзесятыя гады ўступіў на ягоныя сцежкі. Напісаў кнігу *Wierszalin. Reportaż o końcu świata.*

— Не паеду з вамі ў Вершалін, каб не папсаваць сабе настрою, — заяўляе Уладзімір Паўлючук. — Там цяпер нічога няма.

Аднавілі легенду людзі тэатра. У 1994 г. Слабадзянэк паставіў „Прарока Ілью" ў Тэатры тэлебачання. Год пазней Анджэй Варонец падрыхтаваў прэм'еру п'есы ў Theater Kreatur у Берліне. У 1998 г. Мікалай Грабоўскі зрэалізаваў *Прарока* ў кракаўскай Тэатральнай школе. На прафесійнай тэатральнай сцэне п'еса Слабадзянка паявілася ў 1999 г., калі Грабоўскі паставіў яе ў Новым тэатры ў Лодзі... Вось як пачынаецца Слабадзянкаў „Прарок Ілья", а *rzecz się dzieje w sokólskim powiecie na początku lat trzydziestych.* Другая сцэна: прарок Ілья мочыць ногі і штудзіруе Святое Пісанне, разважае пра Бестыю. Паслугоўвае яму Тацяна. Уваходзяць мужыкі, уводзяць прывязаную да калка Вольгу... *Дык вось чаму Ён, наш Прарок і наш Ісус Хрыстос на дадатак у амерыканскіх ботах ходзіць, блядзь...* Вось тая лаянка з берагамі выліваецца і з п'есы Слабадзянка, і з фільмаў *Польская пасія, Цар Мікалай...* Ці было ўсё гэта так?

Тадэвуш Слабадзянэк у свае 20 гадоў прачытаў быў Паўлючука, сеў на ровар, паехаў у Грыбоўшчыну, пасля ў Вершалін. У 1975 г. жыло там яшчэ шмат вернікаў. У Вершалін шмат асоб ездзіла, вярталіся расчараваныя; вершалінцы не хацелі з нікім размаўляць. Пабачыў, што тады засталося ад сталіцы свету: дом, хлеў, клуня, дубы, руіны царквы і разабраных яшчэ саветамі дамоў. Жылі яшчэ Валошын, юродзівы Васіль і тры жанчыны.

Цяпер тут нічога няма.

Міра ЛУКША

Пагранічныя сустрэчы

Фота Томаша МАКОЎСКАГА

Ваду з корчмінскай крыніцы вернікі лічаць цудадзейнай

Аднойчы ў пасляваеннай гісторыі вёскі Такары Сямятыцкага павета здарылася, што на некалькі гадзін можна было быццам бы забыць пра мяжу, раздзяляючую вёску на дзве часткі, якія належаць дзвюм розным дзяржавам. Тады на трэці дзень Святой Тройцы, які ўрачыста адзначаецца ў царкве ва ўрочышчы Катэрка, прыбылі колішнія прыхаджане з беларускай часткі Такароў. Гэтая сустрэча колішніх аднавяскоўцаў і прыхаджан аднаго прыхода запомнілася надоўга. Да сённяшняга дня людзі яе ўспамінаюць і выказваюць жаль, што была гэта аднаразовая ініцыятыва. Аб тым, што магло б быць інакш, сведчаць арганізаваныя ўжо гадамі Дні добрасуседства ў Корчміне на Люблiншчыне.

Пасля вайны Корчмін распалавініла падвойная палася заараная зямлі і двайны калючы дрот. На польскім баку засталася царква, а на ўкраінскім — цудадзейная крыніца. Абодва аб'екты аднолькава блізкія сэрцу вернікаў. Таму спярша хрэсны ход з іконай Корчмінскай Божай Маці ідзе ў Стаіўку (украінскую частку колішняга Корчміна), дзе адбываецца асвячэнне вады ў крыніцы, затым ужо супольны польска-украінскі хрэсны ход вяртаецца ў царкву на польскім баку, дзе служыцца літургія. Штогод царкоўнаму фэсту спадарожнічаюць урачыстыя сустрэчы на граніцы разам з яе адкрыццём, супольныя малітвы, выступленні народных калектываў, трансгранічны культурны кірмаш, кірмаш рэгіянальнага мастацтва, а таксама спатканне ўрадавых і самаўрадавых улад розных узроўняў і няўрадавых арганізацый.

Цяпер зноў вернемся ў Такары. Ці войт Мельніцкай гміны не спрабаваў бы дамовіцца з граданачальнікам Высокага, каб у Такарах ладзіць сустрэчы дзеля ўзаемазбліжэння насельніцтва штучна падзеленай вёскі і замацавання дружбы? У Такарах у будучым мае быць адкрыты пагранпераход. А можа так вышэйшым уладам даць штуршок і паказаць, што ўзаемакантакты патрэбныя мясцоваму насельніцтву, што яны нікому не шкодзяць, а наадварот, духова ўзбагачаюць людзей па абодвух баках мяжы. Не трэба вялікіх арганізацыйных намаганняў, бо на Тройцу ва ўрочышчы Катэрка і так збіраюцца людзі — прыязджаюць іх сотні з навакольных прыходаў. Тады ж чаму не стварыць магчымасці ўдзельніцтва ў святкаваннях колішнім прыхаджанам? А тое, што пагранічнікам будзе трохі больш дадатковай работы, невялікая бяда. Звычайна яны спецыяльна не перашкаджаюцца.

М. Ц.

Усе сядаем за стол, а бацька дастойна, як належыць гаспадару, ставіць бутэльку віна. Усім налівае ў кілішачкі, толькі мне не дае: „Ты яшчэ замалая!" Усе крэсцімся, бацька кажа кароткую падзячную прамову, перадае пажаданні на ўвесь другі год усёй сям'і і пачынаем есці. Нарэшце, думаю, настаў найбольш прыемны момант: смачная яда, а такая не бывае штодзённа...

Каляда ў Плёсках

На дварэ вечарэе. Гляджу ў акно на прыбраныя бліскучымі лямпачкамі дрэвы каля майго гарадскога блока. На момант здаецца, што я ў Амерыцы, у Нью-Йорку. Значыць, прыходзіць Руздво, як у нас гаварылі. Ізноў прайшоў год. Як хуценька цяпер бяжыць час! Гляджу, углядаюся, а думкі мае ляцяць назад, у дзяцінства, у вёску.

Усе мы ў чысценька прыбранай хаце, занятыя работай. Вялікая калатаніна. Сёння Куцця, нічога дзіўнага. Мама стаіць пры пліце, у печы дагараюць палены.

— Хутчэй рабі гаманы, — паганяе старэйшую дачку Маньку, — у печы ўжо гасне, трэба саджаць.

А Маня стараецца як можа. Абедзве з малодшай сястрой Надзяй панясуць гаманы хлопцам на складку-забаву ў другі дзень свята. Кожная дзяўчына стараецца, каб яе гаманы былі найсмачнейшыя. Не дай Бог закалец! — хлопцы будуць смяяцца: кепская гаспадыня! Мама расказвала, як калісьці яе сяброўка прынесла нясмачныя гаманы, дык хлопцы цэлую іх міску павесілі на плоце каля яе хаты. Які сорам быў!

Надзя мае другую работу — трэба нарэзаць сечкі каровам аж на тры дні. Тырчыць дзяўчына паўдня ў клуні пры сячкарні. Вяглядае: можа, прыйдзе сябра Грыша, паможа. Бацька спраўнымі рукамі робіць „дзеда" са збожжавых каласкоў. Паставіць яго ў кутку, пад іконай: падзяка Богу за сёлетні ўраджай і просьба на будучы.

Мне таксама далі занятак: — Ты, Ніна, утры мак на куццю і булачкі, — распарадзілася маці. Булачкі з макам і куцця на калядным стале абавязкова мусяць быць. Сяджу на печы, кручу валком у верцясе, і, каб ніхто не бачыў, раз-пораз аблізваю валок — ён жа салодзенькі, з цукрам, а мне „кішкі марш іграюць", чакаю да зоркі. Толькі старэнькая бабуля Гануся ціхенька сядзіць і грэецца ля цёплай печкі.

На дварэ мароз трашчыць, усюды бела, дрэвы пакрыла шэрань. На яблыньку за кухонным акном прыляцелі птушачкі з чырвонымі і жоўтымі грудзінкамі. Яны весела шчабечуць і скачуць з галінкі на галінку, быццам бы і ведалі, што прыходзіць радаснае святачка. Найлепшы мастак не здолеў бы намаляваць прыгажэйшую карціну ад тае, што за акном.

А я штораз углядаюся ў неба: калі ж першая зорачка пакажацца? — мне так хочацца есці! „Дзед" ужо стаіць у кутку, пакладзена сена, стол засланы абруском, а па ўсёй кухні разносіцца пах каляднага смакоцця. Нарэшце на ясным месячным небе заморгала першая маленькая зорачка. „Мама, — крыкнула я, — давай усё на стол, зорка ўжо ўзышла!" Маці з сястрой пачалі насіць стравы: боршч з сушанымі грыбамі, куццю з макам, аўсяны кісель (які я не вельмі любіла), шчолак з сушанымі яблыкамі і грушамі, вараную ў лупінах катроплю, да таго сялёдку з алеем і цыбулькай, смажаную рыбу і абавязкова пахкія булачкі з макам.

Усе сядаем за стол, а бацька дастойна, як належыць гаспадару, ставіць бутэльку віна. Усім налівае ў кілішачкі, толькі мне не дае: „Ты яшчэ замалая!" Усе крэсцімся, бацька кажа кароткую падзячную прамову, перадае пажаданні на ўвесь другі год усёй сям'і і пачынаем есці. Нарэшце, думаю, настаў найбольш прыемны момант: смачная яда, а такая не бывае штодзённа.

Пасля вячэры ўсе ідзем спаць.

Аўтарка (першая справа) з маці і сёстрамі

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Крыж з сярэдзіны XIX стагоддзя

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Хата ў Плёсках

Сёння ўсяночная, трэба ўстаць у поўнач і ісці ў царкву. І каб не спазніцца, паслухаць прыгожых калядных песень. Толькі мне з бабуляй нікуды няспешна — мы застаемся дома, можам паспаць.

У першы дзень свята раніцай усе доўга спяць — уначы маліліся ў царкве, а і стомленыя перадсвяточнай беганінай. У вёсцы цішыня, усе адпачываюць. Толькі пад вечар яна ажывае. Дзяўчаты і хлопцы бегаюць туды-сюды. Вядома, збіраюцца калядаваць. Яшчэ да свята хлопцы клеілі гвязды, кожная „кумпанія" старалася зрабіць найпрыгажэйшую. Вёска Плёскі вялікая, моладзі многа, таму і кожная кампанія трымалася „сваіх", чужых не прымала. Пескі і Мацейкі дружылі, а Сярэдзіна і Кунгляны трымаліся асобна.

Калі пачынала змяркаць, першымі калядаваць беглі дзеці: хлопчыкі з гвяздай, дзяўчаткі — без гвязды. Я таксама бегала спяваць. Нас было чатыры дзяўчынкі: Надзька, дзве Мані і я, Нінка. І хаця нас было мала відаць пад акном, спявалі мы гучна. А як цешыліся, калі гаспадар даваў нам грошыкі! Потым мы дзяліліся і пасля свят беглі ў „лаўку" па цукеркі.

Дзяўчаты і хлопцы калядаваць хадзілі вечарам, з гвяздаю. А як заспявалі — шыбы ў вокнах дрыжалі, бо і галасы мела наша вясковая моладзь прыгожыя. Усе гаспадары дарылі каляднікам каўбасу і яйкі. Гэта была закуска на складчаную забаву. Хопцы на яе прыносілі толькі гарэлку, а дзяўчаты — гаманы. А гарманіста, Саньку, мелі свайго. Добра наш сусед іграў! Былі і непрыемныя здарэнні. Запамяталася мне, як мы, дзеці, і не толькі, хаваліся па хатах, бо Сцёпка, падпіўшы, ішоў па вуліцы ды сустрэчных разганяў, ламаў гвязды.

Малодшыя замужнія ды жанатыя таксама калядавалі, а потым збіраліся ў хаце, рабілі гасціну — спявалі, весяліліся: на тое і было свята. Часта таксама калядавалі, каб сабраць грошы на патрэбы свайго царкоўнага прыхода.

У другі і трэці калядныя дні па ўсёй вёсцы плылі песні і адгалоссе танцаў пад Санькаву гармонію. А мы, малыя, таксама бегалі на музыкі, хоць мала і што разумелі. Мне найцікавей было глядзець, як танцавалі польку мая суседка Надзя з суседам Грышам: ляцелі яны па зале, як вецер! Усе былі вясёлыя, шчаслівыя...

Прайшло больш за паўстагоддзя. У большасці няма ўжо гэтых людзей, няма моладзі. Толькі пастарэлыя дажываюць ціхенька ў зусім „чужым свеце".

— Бабцю, хадзі на кухню, я не ўмею прыбраць торт, — спыніла мае роздумы ўнучка Оля. Заўтра будуць госці, трэба каб было ўсё смачнае. Іду, іду. Праўда, прыйдуць госці, пасядаюць за сталом, будуць есці, а потым глядзець у тэлевізар, гаварыць пра палітыку, бізнес, Інтэрнэт, *ляптопы*... Толькі я буду слухаць, слухаць, ды мала што з таго пайму. Я ўжо старая, не мой гэта свет. Мой — ужо ў мінулым.

Ніна БРУЧКО

З вёскі Плёскі

У цяперашнім каляровым свеце Плёскі, з вонкавага погляду, здаюцца застойвацца супраць цячэння часу, быццам застыўшы ў шэрасці мінуўшчыны, у нейкай сумнай восені. З напрамку бельска-беластоцкай шашы дамінуючай візіткай вёскі бачыцца шэры трохпавярховы жылы блок з бетонных сцен, з якіх тры дзесяткі гадоў таму будавалася Другая Польшча. Але ж папраўдзе той блок з'яўляецца візіткай тадышняй эпохі, якая тут здавалася быць выхадам у каляровы свет; эпохі жарсна каханай нашым мясцовым пакаленнем пакінуўшым вясковыя хаты. І сёння ён таксама з'яўляецца яе сімвалам, толькі што ўжо незваротна спапялелым, з пустымі бляклымі вокнамі.

Далей за згаданым блокам традыцыйная падляшская вёска, у якую ў розны час праціснулася крыху жылых дамоў, збудаваных або аднаўленых паводле крыху іншых фасонаў. Некаторыя аднаўленні адухоўленыя эстэтыкай мясцовай мінуўшчыны, прыгажосцю колішняга дэкору Малой Айчыны. Гэты эстэтычны ўхіл паказвае, што абліцоўкай хат не займаюцца ўжо людзі з мазалямі ад касы і плуга, што вёску насяляюць людзі іншых, чым земляробчая, прафесій. Пры адной з хат пажылая жанчына абкладае яшчэ сцены прызбай. Аднак у асенняе надвор'е не надта відаць людзей навонкі хат.

Кіруюся да солтыса, але ён заняты справамі сваёй гаспадаркі і не мае акурат часу для гутаркі; рэкамендуе мне недалёкага суседа, які добра ведае ўсе вясковыя справы. Падаюся да яго, ён ахвотна расказвае пра сваю вёску, аднак пакідае за сабою ананімнасць.

— У 1939 годзе ў Плёскі прыйшлі саветы, тут спынілася ваенная часць, якая адбудоўвала спалены дарожны мост на Нарве. Салдаты кватараваліся ў вяскоўцаў, і ў нас жыло іх чатырох: зампаліт Кісялёў, пісар Серада, кухар Цацаркін і Фралоў, які неўзабаве адышоў у Беласток на танкавыя курсы. Серада меў мастацкія здольнасці і ён маляваў партрэты Леніна і Сталіна. У суседа жыў паліт-рук з дзеншчыком. Павесілі карціну пані з Геранімова і гаварылі, што ў нас паны запрагалі мужыкоў араць. Тата ім пярэчыў, але дзед махаў рукою — няхай сабе гавораць што хочуць. Прыносілі балалайкі, іграли, танцавалі. Былі ўкраінцы, рускія і смуглыя; гэтыя апошнія мала адзываліся. Мяне на руках насілі і цукеркамі частавалі. Кіно два разы ў тыдзень паказвалі: на пляцы два слупы паставілі і белае палотнішча між імі павесілі...

Пад „Акцябрскую" адзін папрасіў, каб даць ім бутэльку гарэлкі, бо тады стаяў страшэнны мароз. Салдаты выпілі па шклянцы, закусілі саланінай і на пляц, на парад падаліся. Спявалі:

Ни кукушки и не мины
Не спасали белофинов.
Мы их встретили красиво,
Надавали в хвост и в рыло.

Неўзабаве, калі яны паставілі мост у нас, і ў Страблі, забралі іх на фінскі фронт.

У нашай сям'і было 16 гектараў зямлі, але нашы вяскоўцы былі ў партыі і не дазволілі сваіх кулакоў вывозіць у ссылку. А вось з Кожына, Зубава і Рыбал вывозілі.

Як немец наступаў на саветаў, то за рэчкаю Нарвай байцы на куску няўгоддзя наладзілі абарону. Гаварылі, што адзін казах у вадарэз залез і з „Максіма" не дапускаў немцаў. А калі ўжо немцы прарваліся, то біліся ўрукапашную. Пасля бою немцы сваіх пабітых забралі, а хаваць савецкіх хадзілі ад нас з вёскі. Хадзілі ноччу, бо ўдзень баяліся немцаў; гэта доўжылася мо з тыдзень. Каля аднаго пагранічніка сабака астаўся і нікога не дапускаў да ягонага трупа; толькі калі прагаладаўся то яго ўзялі. Пабітых байцоў хавалі на месцы.

Частка саветаў пасля разгрому немцамі асталася ў гаспадароў, пасля іх немцы палавілі, было такіх каля дваццаці чалавек; некаторыя з іх пазнаёміліся з мясцовымі дзяўчынамі. Адзін рускі ўцёк аж пад Ломжу да нейкага гаспадара і там прабыў аж да вяртання савецкага войска, далучыўся да фронту, а пасля вайны вярнуўся да нас, да мясцовай дзяўчыны. Неўзабаве ён выехаў сам, а пасля і яна за ім падалася ў Гродна і там пасля вайны жылі.

Пасля нейкага часу немцы загадалі ўсім жыхарам хутароў перасяліцца ў вёску; нават Кожына і Ступнікі хацелі выселіць, але ўжо з-за прыходу фронту не ўспелі. Многія перасяленцы прыязджалі ў наша старонне аж ад Белавежы; яны трацілі надзею на вяртанне і прадавалі тут вазы і сані. Адзін гаспадар не хацеў перасяляцца з хутара, то ягоную хату спалілі разам з ягонай мацераю, а жонка выехала да сваіх бацькоў у Кленікі.

У Германію немцы бадай дзве сям'і вывезлі і мо тры-чатыры ў Бельск. А адзінокіх мо каля трыццаці забралі ў Германію; не ўсе яны вярнуліся. Некаторыя загінулі на фронце, з аднае сям'і дачка з сынам прапалі, некаторым не ўдалося вырвацца з Савецкага Саюза.

Пад немцам школа ў Плёсках працавала ў старым школьным будынку. Яе пры цары былі паставілі; у час бежанства наша вёска згарэла, уцалелі каля 5-6 хат, разам з імі і школьны будынак. І пры саветах была тут чатырохгодка. Пад немцам вучыў тут Семянчук з жонкай і „тётя Миля". Да вайны Семенчукі жылі ў Бельску, на тым месцы, дзе цяпер паліцыя. Іх адтуль выселілі і ён прыехаў у Плёскі. Спачатку навучалі па-руску, а пасля Семянчук і Міля па-нямецку. Калі ў Плёскі прыязджалі жандары з Храбалоў, то да іх гаварылі „Guten Morgen". А калі яны заходзілі да падсолтыса, то ён выганяў дзяцей з хаты, каб яны не падслухоўвалі тых жандараў; так ужо дзеці вывучылі нямецкую мову.

Як немец пайшоў на ўсход, то з Полацка прыехаў да нас бацюшка Дзевятоўскі. Ён тут нагатовіў драўніны на царкву, а немцы хацелі яе на мост забраць. Аднак ён умеў па-нямецку гаварыць і ўгаварыў немцаў, каб тую драўніну пакінулі.

Былі мясцовыя партызаны — адзін быў з нашай вёскі — якія хадзілі і забіралі ў людзей дабро. Пасля ім падаслалі камандзіра з Белавежскай пушчы і ён загадаў аддаць людзям зрабаванае. А гэта некаторым партызанам не спадабалася, дваіх не хацелі яму спачатку падпарадкавацца. Было іх усіх сем-восем. У Кнаразах лезлі яны ў адну хату і калі гаспадар пагразіў ім сякерай, яны спалілі яго хату. З партызанамі была дзяўчына са Ступнік, якой бацька крытычна ставіўся да партызан і даносіў на іх. І яны, магчыма што за намовай тае дачкі, забілі ейнага бацьку. Партызаны пабілі і іншых людзей, што на іх даносілі. Наш вясковец, што быў у партызанах, пасля вайны выехаў у Гродна і гаварылі, што недзе там дзяком служыў.

Нашы гаспадары трымалі варту з канцоў вёскі, і калі партызаны прыходзілі да нас, іх прасілі, каб не чапалі нашага солтыса, бо баяліся, што немцы могуць у нас зрабіць тое ж, што і ў Райску. Солтысам у Плёсках быў у вайну Васіль Лемеш родам з Кашалёў, які тут у прыступах быў. Яшчэ перад прыходам фронту, у сенакос, ён уцёк на захад, у Англію. А падсолтыса судзілі, але доказаў супраць яго не знайшлі і, патрымаўшы каля года, выпусцілі на волю.

Пасля вайны каля дзесяці сем'яў выехала ў Савецкі Саюз. Аднаму з нашых вяскоўцаў удалося ўцячы назад, аж з Запарожжа. Выязджаў ён праз зборны пункт у Элку, завёз ён туды свінню і карову. А ў саветаў, у Сімферопалі і Мелітопалі, прадаваў муку ў шклянках і такім чынам зарабляў грошы каб падкупіць пагранічнікаў. Пасля вяртання яго тут бяспека цягала, але ён тлумачыў, што зусім за граніцу не выязджаў, толькі са зборнага пункта ў Элку вярнуўся дахаты. Ён часам гаварыў:

За границею паны
Кушают конфетки.
Настоящий человек
Стоит пятилетки.

А столькі, *полкатушки*, можна было атрымаць за спробу перасячэння мяжы. А можна было атрымаць і цэлую *катушку* — дзесяць гадоў.

Да вайны саветы ў Плёсках калгаса не арганізавалі, такі быў у Рыбалах. А вось пасля вайны і тут утварылі калгас. Калі яго арганізавалі, мяне ў вёсцы не было, служыў у войску. А калі ў 1956 годзе вярнуўся з войска, той калгас ужо раскідалі, прадавалі кароў. У 1954 годзе сталі стаўляць абору, за вёскай, з паўночнага боку. Пры мне навазілі сюды цэглаў. Пасля яшчэ паставілі тут свінарню і шпіхлер. Людзі аралі коньмі пакуль трактар нажылі і ўсё ўручную рабілі.

Пры Герку зноў тут сталі калгас рабіць. Новыя будынкі паставіла фірма. І будавалі іх ужо ў іншым месцы, з боку Бельска. На старым месцы калгаса не разбудоўвалі, бо над Нарваю будавалі адпачынковы комплекс і не хацелі, каб да яго даходзіў смурод ад калгасных жывёл. У старой калгаснай аборы ў гамулкаўскі перыяд гаспадарылі калгаснікі з Дарожак, трымалі там курэй. А калі аднавілі калгас у Плёсках, то тыя старыя будынкі забралі ад Дарожак і гаспадарылі ў ім нашы. Таксама трымалі курэй спачатку, пакуль Амерыка кукурузу давала. А пасля ў старых будынках толькі майстэрні былі, дзе ладзілі і трымалі калгасныя машыны. Цяпер у старым калгасным комплексе пуста, толькі адміністрацыйны будынак нехта звонку купіў і ў ім жыве.

А ў новых будынках, што ад Бельска, многа быдла трымалі, мясных і малочных кароў. Там мо з дваццаць трактароў працавала, і камбайны бадай чатыры. Многа мінеральнага ўгнаення высейвалі, добрае там збожжа расло. І дагляд за гэтым усім спачатку быў, а пасля сталі красці. Але і так усяго не раскралі, яшчэ многа прадалі. Тую навейшую частку купілі прыватныя ўласнікі, браты. Адзін з іх трымае шмат кароў, іншы з'яўляецца ўласнікам згаданага раней жылога блока. У той блок, пры Герку, калі толькі яго пабудавалі, прыехала шмат людзей, нават здалёк. А пасля амаль усе паўцякалі, цяпер у ім мо з чатыры сям'і асталося. Калісь абагравание да яго дастаўлялі ад жывёлаводчага комплексу, цяпер такой пастаўкі няма і яго насельнікі абагравацьць свае кватэры сваім спосабам.

У адпачынковым комплексе пры камуне пабудавалі шмат павільёнаў, якімі карысталіся розныя беластоцкія ўстановы. Цяпер тое ўсё ў прыватных руках і комплекс называецца „Ptasia Osada". Ёсць там, м.інш. верхавыя коні і туды круглагадова едуць госці.

Сама вёска Плёскі старэе. На дзвесце нумароў хат каля шасцідзесяці пустуе. Сельскагаспадарчай таварнай прадукцыяй, апрача ўласніка посткалгаснай фермы, займаецца тут двух ці трох гаспадароў. Школу ў Плёсках закрылі каля пятнаццаці гадоў таму. У пакінутым школай будынку цяпер бібліятэчны пункт і супольная вясковая пасуда. У апошнія канікулы гарадскія нашчадкі мясцовых сялян пабілі вокны і зацерушылі ў запаведным будынку пажар, але ўдалося яго патушыць. Да пажарнай каманды належыць у Плёсках дваццаць адзін чалавек. Раней у пажарнікаў быў самаход, але яго забралі. Пажарнае дэпо месціцца ў іншым будынку, там цяпер і вясковая крама.

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА